

Патэнцыйны дырэктар багатага завода прамяняў хімію на музыку.

СТАР.3



Спартыўныя журналісты прагназуюць фінал мундзіялю.

СТАР.4



Калі ў Баранавічах з'явіцца прытулак для бяздомных жывёл?

СТАР.6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛІПЕНЯ 2014 г. СУБОТА № 129 (27739) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЛІПЕНЬ. ВІЦЕБСК. «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»

## За дваццаць два гады існавання Міжнароднага фестывалю мастацтваў гэтыя паняцці сталі непадзельнымі



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.



Фота БЕЛТА.

Падчас цырымоніі адкрыцця Прэзідэнт уручыў прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва скульптару Івану МІСКО (Беларусь) і вядомай даследчыцы архітэктуры Інэсе СЛЮНЬКОВАЙ (Расія). Спецыяльная ўзнагарода Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» была ўручана Аляксандрам ЛУКАШЭНКАМ народнай артыстцы Расійскай Федэрацыі Надзеі БАБКІНАЙ.

**Віцебск зноў стаў фестывальнай сталіцай, што вабіць гасцей з блізкіх і далёкіх краёў гасціннымі вуліцамі, сонечным (незалежна ад надвор'я) настроем, дзівоснай энергетыкай, якая штогод вірue на сцэнічных пляцоўках горада.**

Сакрэт гэтай незгасальнай энергіі патлумачыў падчас адкрыцця сёлетняга фестывалю Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка: «Крыніцай сілы і энергіі нашага фестывалю служыць славянская культура — адна з самых старажытных, самабытных і багатых на Зямлі. Яна ўвабрала ў сябе традыцыі Усходу і Захаду, беражліва захавала інтэлектуальную і духоўную спадчыну многіх пакаленняў».

«Група славянскіх народаў самая вялікая ў Еўропе. І як бы ні складваліся лёсы пэўных этнасаў, у крытычныя моманты гісторыі адзінства славян заўсёды выяўлялася. Гэта актуальна і сёння», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы, славяне, цэнім і паважаем талент. І не дзелім людзей, якія валодаюць ім, на сваіх і чужых. Таму мы так рады бачыць на гэтым свяце прадстаўнікоў розных кантынентаў, краін і народаў. Наш праект даўно выйшаў за рамкі толькі славянскага форуму. З кожным годам ён пашырае мастацкія і, што немалаважна, геаграфічныя межы. Пры гэтым «Славянскі базар» не губляе галоўны стрыжань і ядро — мастацтва брацкіх народаў Беларусі, Расіі і Украіны, якія стаялі каля яго вытокаў», — адзначыў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да сітуацыі ва Украіне, кіраўнік дзяржавы заявіў: «Ніякай вайны народаў сёння няма. Не ваюе ва Украіне народ з народам, з беларусамі, рускімі і нават з украінцамі. Ёсць нягодныя, непрыстойныя палітыкі, якія некалі недаацанілі гэта адзінства, важнасць гэтага адзінства, з'явілася расколіна, а ў гэтую расколіну пралезлі нашы праціўнікі і ворагі».

Са святочнай сцэны былі зачытаныя і словы прывітання ў адрас удзельнікаў і гасцей фестывалю ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і Прэзідэнта Украіны Пятра Парашэнкі. СТАР.4




Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

***«Адкрытасць беларускай эканомікі абумоўлівае зацікаўленасць нашай краіны ў развіцці гандлёвых і інвестыцыйных сувязяў, лібералізацыі гандлёвага рэжыму мытнай «тройкі» з іншымі краінамі, у тым ліку і высокаразвітымі, але на аснове прынцыпу ўзаемных кампрамісаў і выгод. Можна, у сувязі з гэтым, напрыклад, вітаць пачатак прадметнай прапрацоўкі пытання па стварэнні зоны свабоднага гандлю з Ізраілем, з якім Беларусь развівае шматпланавае супрацоўніцтва».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10240,00 | ■ |
| Еўра | 13940,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 300,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 878,22 | ▲ |

■ Курсавая розніца

## РОСТ РЭЗЕРВАЎ ДАПАМОЖА РУБЛЮ?

**Галоўная навіна беларускага валютнага рынку за апошнія тыдні — гэта павелічэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў. Напрыканцы чэрвеня мы атрымалі ад расійскага банка ВТБ 2 мільярды долараў. Аднак рэзервы выраслі толькі на 1 мільярд.**

Відавочна, што частка грошай пайшла на пагашэнне ранейшых абавязацельстваў урада і Нацыянальнага банка. Тым не менш беларускі рубель атрымаў пэўную падтрымку. Хаця плаўная дэвальвацыя працягваецца. Важна, што днямі мы атрымалі ад расійскага ўрада яшчэ адзін крэдыт — на 450 мільёнаў долараў. Гэта таксама важкае ўкладанне ў эканамічны стан краіны.

Пакуль жа долар адносна айчыннай валюты зноў вырас — на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 10240. Расійскі рубель таксама пачаў вяртаць згубленыя на мінулым тыдні пазіцыі — дадаў 2,5 грашовай адзінкі (плюс 0,8%) да 300,5. А вось еўра адступіў на 20 рублёў (мінус 0,1%) да 13940, нягледзячы на тое, што апошнія тры тыдні толькі рос.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ПЕРАМОГА НАД АГНЁМ

## Падчас пажару 33-гадовая Ірына Лабыкіна выратавала мужа і дваіх дзяцей

**Трагедыя ў жыцці Ірыны і Эдуарда Лабыкіных і іх дзяцей здарылася ў вёсцы Чарэшля Навагрудскага раёна ў ноч на 1 чэрвеня. Паводле асноўнай версіі прычыны ўзгарання (праверка працягваецца), адбыўся выбух газапаветранай сумесі ў кухні. Дом Лабыкіных згарэў цалкам, аднак усе члены сям'і, на шчасце, засталіся жывымі.** СТАР.4



Сям'я Лабыкіных разам з першым намеснікам начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Валерыем РУДОЛЬФАМ, начальнікам Навагрудскага раённага аддзела МНС Ільёй КАЗЛОВЫМ і старшынёй Навагрудскага раённага Савета дэпутатаў Сяргеем МІШАРЫНЫМ.

■ Па сутнасці справы

### НЕ БУДЗЬ ЛАСЫ НА ЧУЖЫЯ КАЎБАСЫ?

**Так ужо склалася, што беларусы любяць паесці мяса. Асабліва свінінку. Як жа гэта без сальца можна? Але нядаўна цэны на «парсючкоў» пайшлі ўверх. Асноўная прычына — скарацілася пагалоўе свіней. Народ пачаў замяняць гэты прабел у сваім рацыёне курацінкай. Аднак і на мяса птушкі цэны сталі расці. Усё гэта занепакоіла не толькі айчынных гаспадынь, але і антыманапольныя органы. «Звязда» далучылася да вывучэння праблемы.**

# ПАГАРАЧЫЛІСЯ ЦІ ЎСЁ Ж ТАКІ ЗГАВАРЫЛІСЯ?

## Невыкананне прадпісанняў Мінэканомікі можа каштаваць птушкафабрыкам да 10% гадавой выручкі

**Тое, што сёння назіраецца на мясным рынку краіны, нельга патлумачыць толькі рашэннем урада аб свабодным цэнаўтварэнні ў гэтым прадуктовым сегменце. Распрацоўшчыкі «цэнавой свабоды» разлічвалі ўбачыць вострую канкурэнтную барацьбу прадпрыемстваў за пакупнікоў. Аднак галоўныя гульцы на рынку вытворчасці птушкі, на здзіўленне, сінхронна і амаль аднолькава істотна павялічылі цэны на сваю прадукцыю. Па асобных пазіцыях сваіх паўфабрыкатаў на птушкафабрыках павелічэнне дасягала нават 30-40%.**

Такое аднachасовае рашэнне вытворцаў даволі яўна нагадвае змову. А змову супраць масавага спажыўца ўжо нельга проста ўтаіць за словамі аб свабодным рынку. Мінэканомікі ў сітуацыі разабралася і заўважыла ў рэзкім павелічэнні адпускных цэн на паўфабрыкаты з мяса птушкі ў маі парушэнні антыманапольнага заканадаўства. Таму эксперты міністэрства і падрыхтавалі прадпісанні аб зніжэнні цэн на паўфабрыкаты з мяса птушкі (аднаўленне ўзроўню цэн, што дзейнічалі да 21 мая) птушкафабрыкам, якія не прынялі меры па зніжэнні цэн у адпаведнасці з лістамі-папярэджаннямі антыманапольнага органа. Падобныя прадпісанні атрымалі чатыры прадпрыемствы: Віцебская бройлерная птушкафабрыка, СТАА «Віткoнпрадукт», ААТ «Смалявічы Бройлер», СЗАТ «Сервалюкс» (філіял «Сервалюкс Агра»).

*(Працяг тэмы на 2-й стар.)*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНЦЫ ЗАБРАЛІ З БАНКАЎ БОЛЬШ, ЧЫМ У КРЫЗІСНЫ 2008-ы

З пачатку гэтага года ўкраінцы забралі з банкаў рэкордныя 6 млрд долараў і 32 млрд грыўняў, паведамляе Укрінформ са спасылкай на фінансавага аналітыка Эрыка Наймана. Паводле яго слоў, падчас крызісу 2008 года ўкраінцы вынеслі 3,8 млрд долараў і 29 млрд грыўняў. «Гэта тлумачыць прычыну рэзкага падзення аб'ёмаў крэдытавання, — піша спецыяліст. — Прычым апошнія скарацiліся традыцыйна менш, чым дэпазітная база. У выніку суадносіны Loan-to-Deposit Ratio выраслі з 1,35 да 1,5 і вярнуліся да ўзроўню канца 2012 года. Так што не чакайце ў бліжэйшыя паўгода ад украінскіх банкаў крэдытнага багацця. Спачатку ўкраінцы павінны вярнуць дэпазіты ў банкаўскую сістэму».

### ДА АБСТРЭЛУ ІЗРАІЛЯ ДАЛУЧЫЛІСЯ БАЕВІКІ ЛІВАНА



У ноч на 11 ліпеня працягваўся абстрэл ракетамі ізраільскіх тэрыторый. Сірэны, якія папярэджваюць аб пагрозе, прагучалі ў Хайфе, Хадары і іншых населеных пунктах, якія размяшчаюцца на тэрыторыі савета Хоф а Кармель, паведамляе NEWSru Israel. Адказнасць за абстрэл узяло на сябе баявое крыло «Хамаса» «Брыгады Ізадзіна аль-Касама». Ізраільская артылерыя ў адказ на выпушчаную ракету абстраляла прыгранічныя тэрыторыі Лівана. Упершыню з пачатку аперацыі «Непарушная скала» па Ізраілі была выпушчана ракета з поўначы: «Кацюша», якую запусцілі з Лівана, упала паміж Метулай і Кір'ян-Шмонай. Відавочна, абстрэл ажыццявіла адна з палесцінскіх груповак Паўднёвага Лівана. Тры запушчаныя ракеты з сектара Газа па цэнтральнай частцы Тэль-Авіва былі перахвачаны сістэмай СПА «Жалезны купал» і збіты над гарадской зонай.

### ГЕРМАНІЯ АБМЯЖОЎВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ЗША НА ЎЗРОЎНІ РАЗВЕДСЛУЖБАЎ

Улады Германіі зрабілі яшчэ адзін крок у адказ на «несяброўскі» шпіянаж з боку ЗША, скараціўшы супрацоўніцтва паміж разведкамі дзвюх краін. Адпаведнае распараджэнне германскім спецслужбам дала канцлер Ангела Меркель, загадаўшы ўрэзаць стасункі з ЗША ў гэтай сферы да мінімуму, піша Bild. Супрацоўніцтва будзе працягнута толькі ў галіне забеспячэння інтарэсаў непасрэдна самой Германіі — бяспекі нямецкіх ваеннаслужачых, якія ўдзельнічаюць у ваенных аперацыях за мяжой, і абароны ад тэрарыстычных пагроз. Напярэдадні Германія выдварыла з краіны прадстаўніка амерыканскіх спецслужбаў, які працаваў пры пасольстве ЗША ў Берліне.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗВЫЧАЙНЫЯ ПРАДУКТЫ — СЯБРЫ ЗДАРОВЫХ ЗУБОЎ

**Ешце часцей цёмны шакалад, клубніцы і піце зялёны чай — лепшы набор прадуктаў для сняданку, калі вы хочаце мець белыя зубы, адзначае The Daily Mail. Пералічаныя прадукты здольны пазбаўляць налёту, што ўтвараецца за ноч.**

У шакаладзе змяшчаецца тэабрамін — злучэнне, якое ўмацоўвае эмаль. А пры трываласці пакрыцця зніжаецца рызыка афарбавання зубоў. Малочны шакалад, праўда, дзейнічае з дакладнасцю да наадварот. Зялёны чай змяшчае танін, што не дае бактэрыям наліпаць да зубоў, і поліфенолы, якія пазбаўляюць бактэрый і нейтралізуюць кіслоты. Да таго ж ён павышае канцэнтрацыю фтору ў ротавай поласці. Яблычная кіслата, якая ёсць у клубніцах, таксама ачышчае зубы. Карысны ў гэтым сэнсе яшчэ і сыр, які павышае ўзровень pH у роце, робіць асяроддзе менш кіслым. А менавіта кіслата разбурае эмаль. Акрамя таго, кальцый з сыру ўмацоўвае тканкі зубоў. Арэхі, семкі, як і любыя цвёрдыя прадукты, якія патрабуюць актыўнага жавання, ачышчаюць зубы механічна. Яны ўмацоўваюць дзёсны, а вось высокі ўзровень вады ў яблыках і грушах спрыяе выпрацоўцы сліны — натуральнага сродку ачысткі ротавай поласці ад бактэрый.

КОРАТКА

Нацыянальны банк Беларусі дазволіў банкам не купляць у фізічных асоб украінскую грыўню.

Сярэдняя стаўка мытных пошлін у Мытным саюзе з верасня знізіцца з 9 да 7%.

Гандлёвая інспекцыя Міністэрства гандлю Беларусі з 22 ліпеня пачне масавыя праверкі рынкаў і гандлёвых цэнтраў.

У чэрвені самым адчувальным для кашалькоў беларусаў стаў рост цэн на бульбу — яна падаражэла амаль у 1,5 раза. А ў цэлым харчовыя тавары ў мінулым месяцы падаражэлі на 1,6% да мая гэтага года і на 13,8% да снежня 2013-га.

Чатыры беларускія птушкафабрыкі могуць быць аштрафаваны ў выпадку невыканання прадпісання Мінэканомікі Беларусі аб зніжэнні адпускных цэн на паўфабрыкаты.

# «Я ЗНОЎ ВЫБІРАЮ «ЗВЯЗДУ»

## Карысныя «летнія» прызы сярод падпісчыкаў разыграны




Фота Надзеі БУЖАН.

Многія (здымаем капялюш!) у чарговы (ці першы?) раз падпісаліся — сярод безлічы розных выданняў выбралі для сябе «родную газету на роднай мове», даслалі свае карткі на розыгрыш прызоў.

Учора ў сценах рэдакцыі ён адбыўся. Адбыўся, як заўсёды, з удзелам нашых падпісчыкаў і, так бы мовіць, дзелавых партнёраў. На гэты раз іх прадстаўлялі Георгій Георгіевіч КАРАЛЁНАК, кінааператар кінастудыі «Беларусьфільм» (студыя «Летапіс»») і супрацоўніца «Белсаюздрука» Тамара Іванаўна ВАРАБ'ЁВА (на здымку). Менавіта яны з усіх дасланых картак «выбіралі» шчаслівыя...

Прозвішчы ды адрасы уладальнікаў звяздоўскіх навамодных касілак-трымераў і сушылак для агародніны чытайце ў наступным нумары «Звязды». Пакуль жа зазначым, што на гэты раз у латарэі найбольш пашчасціла мінчанам.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# ДАХОДЫ БЮДЖЭТНІКАЎ ЗА ЧЭРВЕНЬ ІНДЭКСАВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

**Індэксацыя грашовых даходаў беларусаў, якія атрымліваюцца з бюджэтных крыніц, залежыць ад індэкса спажывецкіх цэн.**

Паводле інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у адпаведнасці з Законам «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі», грашовыя даходы бюджэтнікаў (заработная плата; грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, курсантаў ваенна-навучальных устаноў і сувораўцаў; дзяржаўныя стыпендыі навучэнцам, стыпендыі клінічным ардынатарам, стыпендыі работнікам, накіраваным на павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўку, стажыроўку ў вочнай (дзённай) форме навучання ў іншы населены пункт) за чэрвень не індэксуюцца. Гэта звязана з тым, што індэкс спажывецкіх цэн не перавысіў 5-працэнтны парог да месяца іх аднаразовага перагляду (май 2014 года).

Дапамогі па беспрацоўі і стыпендыі грамадзянам у перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі па накіраванні органа па працы, занятасці і сацыяльнай абароне таксама не індэксуюцца, паколькі індэкс спажывецкіх цэн за чэрвень не перавысіў 5-працэнтны парог да месяца іх аднаразовага перагляду (красавік 2014 года). Будуць праіндэксаваныя толькі зарплаты дзяржаўных служачых і прыраўнаваных да іх асоб, а таксама грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых і асоб радавога і начальніцкага складу — на 17,4%, паколькі індэкс спажывецкіх цэн за чэрвень не перавысіў 5% да месяца іх папярэдняй індэксацыі (май 2014 года).

Тым, хто атрымлівае даходы на тэрыторыі нашай краіны з іншых крыніц, кампенсацыя страт ад інфляцыі ажыццяўляецца па падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

Нагадваем, што пры індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва за чэрвень індэксуецца даход у межах 100% бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, дзеючага на момант індэксацыі (1.212.470 рублёў). Частка даходу, якая перавышае гэтую суму, індэксацыі не падлягае.

# У МІНСКУ КОШТ ЖЫЦЦЯ НІЖЭЙШЫ

**Самымі дарагімі гарадамі свету ў першай палове 2014 года сталі Цюрых (Швейцарыя), Ставангер (Нарвегія) і Жэнева (Швейцарыя) — індэксы спажывецкіх цэн там зашкальваюць за 150%.**

Мінск знаходзіцца на 342-м месцы сярод 446 гарадоў вышэйназванага рэйтынгу. Індэкс спажывецкіх цэн для Мінска — 51,81%, што амаль у тры разы ніжэй, чым у самых дарагіх гарадах свету. Пры гэтым індэкс арэнды жылля складае 18,93%. Усе індэксы для гарадоў прадстаўлены ў параўнанні з узроўнем жыцця ў Нью-Ёрку. Гэта значыць, што калі індэкс спажывецкіх цэн або арэнды жылля ў горадзе, напрыклад, раўняецца 74,03% (як у Маскве), гэта значыць, цэны або арэндная плата ў гэтым горадзе на 25,97% ніжэйшыя, чым у Нью-Ёрку. У Кіеве кошт жыцця трохі ніжэйшы, чым у Мінску. Індэкс спажывецкіх цэн у ім склаў 47,89. Але пры гэтым індэкс арэнды жылля — 26,35. У Еўропе ў спісе самых дарагіх гарадоў дамінуюць гарады Швейцарыі і Нарвегіі. У Амерыцы ў сувязі з тым, што афіцыйны курс штучна заніжаны, самым дарагім горадам у першай палове 2014 года стаў Каракас. Самы нізкі ўзровень жыцця адзначаны ў гарадах Індыі, а таксама Непала, Пакістана, Егіпта, Македоніі і Малдовы.

**Святлана БУСЬКО.**

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2014 | на 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 565 756 | 381 510 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 8 195 | 13 449 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 657 869 | 1 009 054 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 790 027 | 1 551 116 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 2 272 174 | 1 593 354 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 15 239 058 | 12 911 750 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 1 836 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 29 786 | 29 786 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 1 147 766 | 806 818 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 4 714 | 12 225 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 194 851 | 212 171 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 20 910 196 | 18 523 069 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 103 913 | 349 567 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 9 795 788 | 8 596 675 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 7 493 778 | 6 311 694 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 90 275 | 400 516 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 235 778 | 245 502 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 17 719 532 | 15 903 954 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 1 174 075 | 1 174 075 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 369 717 | 245 427 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 594 088 | 471 351 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 1 052 784 | 728 262 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 3 190 664 | 2 619 115 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 20 910 196 | 18 523 069 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 6 месяцев 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | за 6 месяцев 2014 года | за 6 месяцев 2013 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1 166 768 | 936 410 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 533 574 | 496 770 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 633 194 | 439 640 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 320 901 | 234 306 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 103 307 | 61 312 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 217 594 | 172 994 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 1 109 | (1 375) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 2 342 | 23 313 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 60 661 | 38 496 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (4 166) | (6 945) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 226 484 | 146 266 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 23 385 | 15 618 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 359 918 | 253 862 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 22 488 | 48 750 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 325 229 | 232 863 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 53 409 | 36 755 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 271 820 | 196 108 |

**Председатель Правления** **П.В.Каллаур**

**Главный бухгалтер** **Л.А.Филиппова**

**Дата подписания 8 июля 2014 года**

Отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность за 2014 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь»

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.*

■ Па сутнасці справы

# ПАГАРАЧЫЛІСЯ ЦІ?..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Заўважылі спецыялісты і неправамерныя дзеянні, якія негатыўна паўплывалі на рынак мяса свініны. Было выяўлена, што Брэсцкім, Гродзенскім аблвыканкамамі і Камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама былі прыняты акты і накіраваны адпаведныя лісты аб павелічэнні закупачных цэн на свіней арганізацыям аграпрамысловага комплексу.

У гэтай частцы «антыманапольным заканадаўствам устаноўлена забарона на прыняцце актаў, заключэнне пагадненняў, учыненне іншых дзеянняў, якія абмяжоўваюць самастойнасць гаспадарчых суб'ектаў і ствараюць дыскрымінацыйныя ўмовы дзейнасці для іх, калі такія акты або дзеянні маюць альбо могуць мець сваім вынікам абмежаванне канкурэнцыі і (або) прычыненне шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам гаспадарчых суб'ектаў або грамадзян».

Менавіта таму Брэсцкаму, Гродзенскаму аблвыканкамам і Камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама вынесены прадпісанні аб адмене ўсіх выдадзеных актаў, якія тычацца павелічэння закупачных цэн на свіней. Гэтым органам мясцовага кіравання загадана таксама забяспечыць зніжэнне закупачных цэн на свіней і, адпаведна, адпускных цэн на мяса свініны і мясапрадукты. Гэтыя прадпісанні неабходна выканаць у тэрмін да 21 ліпеня.

Як адзначыў учора **дырэктар Дэпартамента цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі Ігар ФАМІН,** гэтыя прадпісанні абавязковыя да выканання. Аб гэтым гаворыць закон аб процідзеянні манапалістычнай дзейнасці, які ўступіў у сілу сёлета з 1 ліпеня. Невыкананне пагражае адміністрацыйным штрафам ад 20 да 100 базавых велічынь, які накладаецца на службовых асоб. Таксама ў гэтым выпадку заканадаўствам прадугледжаны штраф на юрыдычных асоб у памеры да 10% ад выручкі па гадавым абароце на гэтым рынку. Канкрэтны памер штрафу будзе вызначацца з улікам таго, як далей выконваецца гэтае прадпісанне. У асобных выпадках падобны штраф не будзе вынесены парушальнікам, калі прадпісанне яны выканаюць у поўным аб'ёме. Ігар Фамін разлічвае, што напрыканцы ліпеня адпускныя цэны на мясным рынку, а таксама рознічныя для насельніцтва паменшацца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПАДАРАЖАННЕ МЯСА ПРЫМУСІЛА ГАСПАДЫНЬ ВЫНАХОДЗІЦЬ НОВЫЯ РЭЦЭПТЫ

**Пасля рэзкага скачка цэн на мяса, які адбыўся ў канцы мая — пачатку чэрвеня, часовае зацішша. Сёння ў магілёўскіх магазінах кілаграм свініны каштуе: шыйнай часткі ад 87500 рублёў (Магілёўскі мясакамбінат) да 108500 (ААТ «Александрыйскае»), лапатачнай — ад 85300 (агракамбінат «Усход») да 96500 (Магілёўскі мясакамбінат), тазабедранай — ад 83850 (агракамбінат «Зара») да 97100 (ААТ «Александрыйскае»). Каля мясных прылаўкаў магазіна сеткі «Квартал» па вуліцы Першамайскай свабодна. Кілаграм мяса катлетнага тут прапаноўваюць аж за 82 тысячы рублёў. Амаль на 14 тысяч даражэй каштуе свініна з лапаткі. Бядро курынае каштуе 53950 рублёў за кіло.**

На Цэнтральным рынку Магілёва мяса на любы густ — былі б грошы. Але народ не вельмі спяшаецца яго набываць. Вось падышла бабулька, прыцанілася і ўзяла кілаграм больш таннай пячонкі па 35 тысяч рублёў. «А выразка не па маім кашальку, — патлумачыла яна. — Яшчэ ў канцы мая кілаграм мяса з шыйнай часткі каштаваў каля 70 тысяч рублёў, а сёння танней, чым за 95 тысяч не знайсці».

— Не, мяса — гэта не для нас, — уздыхае жанчына сярэдніх гадоў. — Не паверыце, у канцы мая свіны разруб набывала ў калгасных крамах па 35 тысяч рублёў за кілаграм, а цяпер ён удвая даражэйшы. Учора ўбачыла сасіскі вышэйшага гатунку амаль па 70 тысяч за кілаграм. Дык там таго мяса кот наплакаў.

Цэны і насамрэч уражваюць, нягледзячы на тое, што гэта будны дзень, прычым другая палова. Калі меркаваць па вітрынах, пакупнікоў было няшмат. Сімпатычная прадаўшчыца абяцае аддаць свой тавар танней, але, калі глядзіш на цэннікі — 130 тысяч за паляндвіцу, 90 тысяч за лапатачную частку — нават яе зніжкі не цікавяць. Якая карысць ад «сэканомленых» 2-3 тысяч?

Вось жанчына просіць узважыць на 100 тысяч ялавічных абрэзкаў па 30 тысяч за кілаграм. Кажа, што ёй вельмі пашанцавала купіць добры кусок з лапаткі ўсяго за 75 тысяч. Катлеты атрымаюцца добрыя. Муж пастаянна ў камандзіроўках, трэба нешта з сабой у дарогу ўзяць. Яшчэ выратоўвае салёнае сала, але яно па 130 тысяч за кілаграм і цана на яго яшчэ не зніжалася.

— А я знайшла, як выйсці са становішча, — падзялілася яшчэ адна жанчына. — Набываю курынае шашлычнае мяса ў калгасным магазіне па цане 40 тысяч за кілаграм, перакручваю яго са свінінай, і атрымліваюцца цудоўныя катлеты. Такія паўфабрыкаты сёння каштуюць да 70 тысяч рублёў. Але там спрэс адны жылкі і храсткі.

Больш пакупнікоў вакол курыных прылаўкаў. Хаця і тут цэны ўзляцелі. Тая ж бройлерная курыца яшчэ, здаецца, месяц таму каштавала 23-24 тысячы за кілаграм, а цяпер ужо 29950 — 32100 рублёў. Супавую курыцу, дзе касцей больш, чым мяса, можна набыць па цане 21700-23800 за кілаграм. А вось кіло курынага бядра каштуе ў межах 52950—56600 рублёў, грудак — 53950—57050, кумпячкоў — 42500—49000 рублёў.



Але ёсць на рынку мясныя кропкі, дзе пакупнікоў зашмат. Ледзь праціскаюся ў фірменны кіёск ад прадпрыемства «Магілёўхлебапрадукты». Выразка каштуе каля 93 тысяч рублёў — амаль на 30 тысяч танней за базарную, фарш свіны — 58100 рублёў, кіло тазабедранай часткі больш за 86 тысяч рублёў. Нехта цікавіцца свіным рагу, але яго няма. Кажуць апошні раз «косці» прадаваліся па 10 тысяч за кілаграм.

Каля кіёска сельгаспрадпрыемства «Авангард» чарга чакае машыну з таварам. Прадаўшчыца п'е чай і не супраць падзяліцца меркаваннем наконт цэн. «У нас нічога не затрымліваецца, — запэўнівае яна. — Паглядзіце, колькі каштуе мяса ў прыватнікаў. За выразку ў выхадныя там просяць да 150 тысяч за кіло, а наша каштуе каля 90 тысяч. І астатнія цэны вельмі прывабныя: лапатка — 80 тысяч, тазавая частка — 84 тысячы, свежае сала 43500, грудзінка — 45 тысяч. Гэта нармальныя цэны. А 12 гадзіне ў мяне прывоз, а пасля дзвюх ужо нічога не застаецца».

Да кіёска пад'язджае машына, і прадаўшчыца бяжыць прымаць тавар. Кіроўца адчыняе дзверцы кузава, і людскі натоўп ледзь не ўскоквае ўнутр. Кіроўца сярдзіта крычыць: «Людзі, дайце разгрузіцца!» Але яго мала хто слухае. Усе хочуць мяса. Таннага.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## НЯМА САМАСТОЙНАГА РАШЭННЯ

**Міністэрства эканомікі прадпісала знізіць адпускныя цэны на паўфабрыкаты з мяса птушкі чатыром птушкафабрыкам, у тым ліку і ААТ «Смалявічы Бройлер» Мінскай вобласці. Менавіта тут не прынялі неабходных захадаў па змяншэнні іх да ўзроўню, што дзейнічаў да 21 мая.**

Нагадаем, адпускную цану на паўфабрыкаты ўстанаўлівае сам вытворца. З 21 мая сёлета максімальная адпускная цана на птушку пастановай Міністэрства эканомікі павышана на 10%. І, па логіцы, кошт паўфабрыкатаў павінен быў павялічыцца на адпаведную велічыню — ніяк не больш. У ААТ «Смалявічы Бройлер» канстатавалі, што іх фабрыка ўваходзіць у групу кампаній «Сервалюкс». Таму яны не могуць прыняць самастойнага рашэння па змяншэнні адпускных цэн. Усё залежыць ад вышэйшага кіраўніцтва.

Што тычыцца свініны, то на Слуцкім мясакамбінаце лічаць, што далейшае развіццё падзей залежыць ад узроўню закупачных цэн. Прадпрыемства выйшла з адпаведнымі прапановамі ў Камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама. Адзначу, што гэтаму ведамству Мінэканомікі вынесла прадпісанні аб адмене прынятых у другім квартале 2014 года актаў па павелічэнні закупачных цэн на свіней. Застаецца спадзявацца, што ў сувязі з гэтым, адпаведна, паменшацца і адпускныя цэны на свініну і прадукты з яе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Абітурыент-2014

# АПОШНІ ДЗЕНЬ

## У прыёмных камісіях ВНУ рыхтуюцца да «аншлагу»...

**Сёння ў прыёмных камісіях ВНУ чакаецца аншлаг. Традыцыйна апошні дзень падачы дакументаў — самы напружаны для членаў прыёмных камісій, бо, як правіла, абітурыенты з не вельмі высокай сумай балаў у сертыфікатах да апошняга маніторыць конкурсную сітуацыю каля сваіх камп'ютараў і не спяшаюцца з візітам у ВНУ. Многія маладыя людзі будуць перападаваць у апошні момант дакументы на іншыя спецыяльнасці, дзе шанцаў стаць студэнтамі ў іх значна больш. У прыёмных камісіях з жалем канстатуюць, што абітурыенты часта выбіраюць не будучую прафесію і не канкрэтную ВНУ, а арыентуюцца выключна на прахадныя балы...**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Але ў прыёмнай кампаніі гэтага года ёсць адно істотнае адрозненне — гэта вельмі сціслыя тэрміны падачы дакументаў. У Міністэрстве адукацыі палічылі, што пяці дзён дастаткова для таго, каб вызначыцца з выбарам і прынесці свае дакументы ў прыёмную камісію. Абітурыенты з высокімі баламі і сапраўды паспелі ўжо выканаць сваю місію — афіцыйна «аформілі» свой выбар. Аднак значная колькасць абітурыентаў яшчэ вагаюцца, таму ў апошнія гадзіны работы прыёмных камісій сітуацыя можа карэнным чынам змяніцца.

У некаторых ВНУ было прынята рашэнне абмежаваць у апошні дзень паток людзей у карпусы, дзе працуе прыёмная камісія, а таму абітурыентам прыйдзецца развітацца з «групай падтрымкі» ў выглядзе бацькоў, сяброў, сваякоў, рэпетытараў яшчэ на парозе ВНУ.

### БДУІР: балы — ад 360

Безумоўна, у выйгрышным становішчы знаходзяцца сёння абітурыенты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Як і ў папярэднія гады, тут дзейнічае аўтаматызаваная сістэма падачы заяў і залічэння, якая дазваляе абітурыентам удзельнічаць у конкурсе на некалькі спецыяльнасцяў адначасова. Але калі раней колькасць спецыяльнасцяў была абмежавана (у мінулым годзе максімум 7), то сёлета абітурыенты могуць указваць у парадку расстаноўкі прыярытэтаў адразу 34 спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю і 2 спецыяльнасці эканамічнага профілю. Акрамя гэтага, абітурыенты атрымалі магчымасць ствараць персанальныя электронныя кабінеты, што значна спрасціла працэдуру падачы дакументаў.

**Сярод ахвотных вывучаць міжнароднае права і міжнародныя адносіны ў БДУ ёсць 2 чалавекі, якія набралі ў суме за тры сертыфікаты ЦТ і атэстат больш за 390 балаў.**

У той жа час, як канстатуюць у ВНУ, права ўказаць у заяве любую колькасць спецыяльнасцяў не вельмі зацікавіла абітурыентаў. Пераважная большасць з іх дэманструе адданасць канкрэтным спецыяльнасцям і факультэтам.

Як і летась, на піку папулярнасці ў абітурыентаў БДУІР аказаліся спецыяльнасці факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Так, за першыя тры дні падачы дакументаў на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» на 70 бюджэтных месцаў прэтэндавалі ўжо 183 чалавекі. На спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» на 50 месцаў падалі дакументы 173 чалавекі. Прычым балы ў ахвотных навучацца на ФКСіС проста зашкальваюць: 360, 370, 380 і нават больш за 390 балаў.

Інжынерна-эканамічны факультэт БДУІР ужо, можна сказаць, таксама ўкамплектаваўся: 46 чалавек заявілі пра сваё жаданне навучацца на спецыяльнасці «Эканоміка электроннага бізнесу» пры 18 бюджэтных месцах, і 49 чалавек падалі дакументы на спецыяльнасць «Інфармацыйныя тэхналогіі ў бізнес-менеджменце» пры 15 бюджэтных месцах. На спецыяльнасці «Праграмуемыя мабільныя сістэмы» конкурс таксама перавысіў два чалавекі на месца. Але дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што не на ўсіх спецыяльнасцях у БДУІР назіраецца такая аптымістычная сітуацыя. Усё ж такі размова ідзе пра тэхнічную ВНУ. А вынікі здачы на ЦТ абітурыентамі матэматыкі і фізікі аказаліся вельмі сумнымі: адсеў склаў больш за 40 працэнтаў ад агульнай колькасці ўдзельнікаў...

### БНТУ: у пашане — эканоміка

Ці не таму і ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, і ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце абітурыенты не выстройваюцца ў чэргі? Магчыма, чакаюць магчымасці паўдзельнічаць у другой хвалі залічэння, калі на вакантныя бюджэтныя месцы будуць дапушчаны абітурыенты з больш нізкімі баламі ў сертыфікатах?

У БНТУ, што нельга назваць нечаканасцю, не назіраецца праблем з запаўненнем эканамічных спецыяльнасцяў. Напрыклад, на спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» прахадны бал за два дні да заканчэння тэрміну падачы дакументаў складаў 294, на спецыяльнасці «Маркетынг» — 246, «Экспертыза і кіраванне нерухомасцю» — 218. Прыцягнулі ўвагу маладых людзей таксама спецыяльнасці «Транспартная лагістыка» (прахадны бал 268), «Мытная справа» (269), «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (278), «Арганізацыя перавозак і кіраванне на аўтамабільным і гарадскім транспарце» (213), «Аўтасэрвіс» (193), «Ацэначная дзейнасць на аўтамабільным транспарце» (177). А вось усе астатнія спецыяльнасці пакуль яшчэ далёкія ад свайго запаўнення...

### БДУ: замест залічэння — 100 балаў

Цікавая сітуацыя складваецца ў БДУ, дзе ў папярэднія гады рэгулярна ўзнікалі праблемы з залічэннем абітурыентаў на звышпрэстыжныя спецыяльнасці факультэта міжнародных адносін. Справа ў тым, што пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па прадмеце «Грамадазнаўства» раней мелі права быць залічанымі на гэтыя спецыяльнасці без уступных іспытаў, і яны фактычна выціскалі абітурыентаў з вельмі высокімі баламі па выніках ЦТ. І летась, напрыклад, не змог стаць студэнтам нават абітурыент, які меў 386 балаў з 400 магчымых.

Цяпер пры паступленні на спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Эканамічнае права», «Дзяржаўнае кіраванне і права» пераможцам рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве выстаўляюцца аўтаматычна 100 балаў па гэтай дысцыпліне. Адсутнасць права паступаць без экзаменаў ніколькі не паўплывала на конкурсную сітуацыю і прахадныя балы, якія зноў будуць вельмі высокія. Сярод ахвотных вывучаць міжнароднае права і міжнародныя адносіны ёсць 2 чалавекі, якія набралі ў суме за тры сертыфікаты ЦТ і атэстат больш як 390 балаў, і яны ўжо дакладна могуць лічыць сябе студэнтамі. А ўвогуле на 30 месцаў было пададзена ўжо больш за 80 заяў. Шмат абітурыентаў маюць больш за 370 і 380 балаў — і вось паміж імі, напэўна, і будзе разгортвацца конкурс.

**У апошні дзень прыёму дакументаў допуск абітурыентаў у будынак, дзе размяшчаецца прыёмная камісія, будзе спынены ў 18 гадзін. Прыёмная камісія ў 18 гадзін спыніць выдачу дакументаў абітурыентам з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць. Пры гэтым будзе забяспечаны прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, што паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся.**

На факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, дзе абітурыентам трэба здаваць фізіку і матэматыку, 4 чалавекі маюць больш за 380 балаў і 17 чалавек набралі больш за 370 балаў. Сюды ж падаюць дакументы і пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд (36 чалавек паступаюць без уступных іспытаў). Такім чынам, самую вядомую, не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, матэматычную школу чакае добрае папаўненне. Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій пераможцы рэспубліканскай алімпіяды таксама не абмінаюць сваёй увагай, хапае тут і ўладальнікаў вельмі высокіх балаў — больш за 350. Але сюды ж падаюць дакументы і абітурыенты з дастаткова нізкімі баламі — у дыяпазоне ад 150 да 200. А паколькі кантрольныя лічбы набору на гэты факультэт высокія, то слабыя абітурыенты могуць і прайсці, прычым нават на «бюджэт». І затрымаюцца ва ўніверсітэце, напэўна, да першай сесіі...

Застаецца нагадаць абітурыентам, што ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне аб ходзе іх падачы будзе спынена ў 15 гадзін. Такім чынам, у абітурыентаў будуць тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам спецыяльнасці або ВНУ. У апошні дзень допуск абітурыентаў у будынак, дзе размяшчаецца прыёмная камісія, будзе спынены ў 18 гадзін. Прыёмная камісія ў 18 гадзін спыніць выдачу дакументаў абітурыентам з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць. Пры гэтым будзе забяспечаны прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, што паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся. Калі спатрэбіцца, то прыёмныя камісіі будуць працаваць да апоўначы. Але ўсе спадзяюцца, што да гэтага справа не дойдзе...

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАЛЯВАННЕ НА БАКАСА — АДКРЫТА!

**Сёння пачынаецца летне-асенні сезон палявання на бакаса.**

Як паведамілі ў Беларускім таварystве паляўнічых і рыбаловаў, паляванне дазволена толькі ўдзень, з падыходу, выключна з паляўнічымі сабакамі — выжламі, спаніэлямі, рэтрыверамі. З адным сабакам могуць паляваць не больш за тры паляўнічыя. У паляўнічых пуцёўках у графе «Асаблівыя ўмовы» пазначаюцца парода, мянушка, нумар і іншыя звесткі рэгістрацыйнай карткі сабакі.



Паляванне на бакаса будзе доўжыцца да 9 жніўня, пасля чаго пачнецца паляванне і на астатніх птушак.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## ЦЭМЕНТНЫЯ ЗАВОДЫ АБ'ЯДНАЮЦЬ У ХОЛДЫНГ

**Адпаведная пастанова Савета Міністраў № 652 ад 7 ліпеня прадугледжвае стварэнне рэспубліканскага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Беларуская цэментная кампанія».**

Дакументам вызначаецца, што ў распараджэнне новага холдынга будуць бязвыплатна перададзены дзяржаўныя акцыі двух адкрытых акцыянерных таварystваў — «Беларускі цэментны завод» і «Крычаўцэментнашыфер».

Ва ўпраўленні Беларускай цэментнай кампаніі будуць знаходзіцца 100-працэнтныя пакеты статутнага фонду абодвух заводаў, якія ўяўляюць сабой 723192 акцыі адкрытага акцыянернага таварystва «Беларускі цэментны завод» і 196697461 акцыя ААТ «Крычаўцэментнашыфер», паведамілі ў прэс-службе Дзяржкаммаёмасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «МІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ»

**Пад такой назвай у Магілёве адкрылася выстава вядомага магілёўскага фотакарэспандэнта Алега Файніцкага.**

На здымках — задуменныя, шчаслівыя, кранальныя твары ветэранаў. А побач — маладыя. Усхваляваныя, натхнёныя, уважлівыя. Маленькія імгненні, падгледжаныя мастаком, невялічкія замалёўкі з нашага жыцця. А па сутнасці, наша сучаснасць, якая злучае тое самае мінулае з будучым, усё лепшае з таго, што было знята на фотакамеру за апошнія 10 гадоў. На адкрыццё выставы ў этнаграфічны музей Магілёва прыйшлі ў тым ліку і героі яго фотарэпартажаў.

— У гэтага майстра вельмі добра атрымліваецца перадаць думкі, эмоцыі, сутнасць чалавека, — адзначыў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік унутранай службы Мікалай Падшываленка. — Калі гістарычныя факты можна сказіць, то фота заўсёды кажа толькі праўду.

У Алега Файніцкага гэта другая персанальная выстава, але ў якасці аднаго з таленавітых майстроў магілёўскага фотаклуба «Вясёлка» ён неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных выставах. Яго фота вядомы таксама па сайце БелТА, дзе ён працуе ў якасці вядучага фотакарэспандэнта па Магілёўскай вобласці апошнія 11 гадоў. Пра сваю выставу аўтар сціпла кажа, што вельмі хацеў такім чынам падзякаваць пераможцам.

## У БАБРУЙСКУ КАНФІСКАВАЛІ НЕВЯДОМЫ ВІД ПСІХАТРОПАЎ

**На Магілёўшчыне перакрыты канал пастаўкі псіхатропных рэчываў з Масквы ў Беларусь, які арганізаваў 29-гадовы жыхар Бабруйска. У яго канфіскавана буйная партыя небяспечнага тавару агульнай масай 48,5 г.**

— Гэты від псіхатропаў яшчэ не сустракаўся на тэрыторыі рэспублікі, — адзначыў начальнік упраўлення наркакантролю і процідзеяння гандлю людзьмі УУС Магілёўскага аблвыканкама палкоўнік міліцыі Уладзіслаў Кавалёў. — Але па ініцыятыве МУС загадзя быў унесены ў пералік забароненых.

Мужчыне пагражае адказнасць па частцы 1 артыкула 328 КК РБ у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ МАТАЦЫКЛІСТЫ

**Магілёўскія супрацоўнікі ДАІ занепакоены ростам колькасці ДТЗ з удзелам аматараў двухколавага віду транспарту.**

За першы тыдзень ліпеня матацыклісты тройчы траплялі ў спіс парушальнікаў правілаў дарожнага руху. Сярод іх — 24-гадовы жыхар Быхаўскага раёна, які катаўся без правоў ды яшчэ і нападпітку, 21-гадовы жыхар Мінска, які не справіўся з кіраваннем, і 16-гадовы падлетак, матацыкл якога сутыкнуўся з «Сітраенам».

— Акрамя адсутнасці дакументаў на права кіраваць матацыклам і злоўжывання спіртным, парушальнікі грашаць таксама адсутнасцю моташлема і спецыяльнай экіпіроўкі, — удакладніла інспектар аддзялення ДАІ УУС Магілёва Таццяна Старасотнікава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Гастролі

# Танцы з грузінскім каларытам,

## альбо Сусветная «зорка» балета Ніна Ананіяшвілі выбрала Ігара Артамонава

Народны артыст Беларусі Ігар Артамонаў быў адной з галоўных «зорак», якую горача вітала мінская публіка падчас сустрэч у рамках «Балетнага лета». Асабліва падчас спектакляў, якія прывезла да нас на гастролі балетная трупа Тбіліскага дзяржаўнага тэатра імя Паліяшвілі. І стала зразумела: наш Артамонаў — амаль што грузін. Дастаткова было паглядзець балет «Сагалабелі» (харэаграфія Ю. Посахава), каб зразумець, чаму ў яго так плённа складваецца супрацоўніцтва з грузінскай трупай: добры артыст, які здольны танцаваць усё. Такі добры, што яго нават пажадала бачыць сваім партнёрам цудоўная Ніна Ананіяшвілі, народная артыстка Грузіі і Расіі, якая пакарыла сусветна вядомыя тэатральныя сцэны. І працягвае танцаваць. Разам Артамонавым яны танцавалі ў Мінску балет «Маргарыта і Арман» у пастаноўцы Фрэдэрыка Эштана (балетны варыянт опернай «Травіяты», паводле «Дамы з камеліямі»).



**Народная артыстка Грузіі і Расіі Ніна Ананіяшвілі патлумачыла:**

— Калі я думала, як паказаць вам нешта адметнае, то вырашыла, што трэба прывесці Эштана «Маргарыта і Арман». Гэта эпахальны балет, які быў пастаўлены ў свой час на Марго Фантэйн і Рудольфа Нурыева. І калі не стала Марго, гэты балет не ішоў ні ў адным тэатры. Яго доўга не ставілі. Аднаўленне зрабілі амаль праз 40 гадоў на Сільві Гілем (яна вельмі захацела) у Каралеўскім тэатры Ковент-Гардэн. А другая балерына, якая атрымала права танцаваць гэты балет, была я... Цяпер мы маем спектакль у сваім тэатры. Потым я дапамагла яго мець у тэатры Станіслаўскага Сяргею Філіну. Блiскучы твор: у маленькім паўгадзінным балеце паказана ўся гісторыя «Дамы з камеліямі». Спектакль з мінімальнымі дэкарацыямі, але адчуваецца і атмасфера, і сэнс. Два чалавекі трымаюць спектакль. Са мной танцуе Ігар Артамонаў — я яму вельмі ўдзячная. Ён амаль што стаў грузінам. Ён таксама будзе танцаваць з намі ў нашым грузінскім балеце. Мы яго практычна «прапісалі» ў сябе!..

Сяброўства з «зоркай» сусветнага балета Нінай Ананіяшвілі пайшло на карысць беларускаму балету наогул. А таксама паўплывала на развіццё айчыннай балетнай публікі, якая, акрамя класічных балетаў, змагла пабачыць іншую харэаграфію, як яна развівалася ў XX стагоддзі — у неакласічным кірунку, а таксама ў постмадэрнісцкім. Між іншым, дзякуючы гастролям балетнай трупы Тбіліскага тэатра імя Паліяшвілі, калі можна было пабачыць «Шэсць танцаў» у пастаноўцы Іржы Кіліяна, стала зразумела: балет — не толькі бездакорная вытанчанасць ліній, гэта заўсёды сэнс. А таксама — гумар і нават «сцёб». І сучасны балет — гэта мастацтва шматаблічнае, часам лаканічнае, стрыманае, эфектнае. Але нават тады, калі ў аздабленні сучаснага балета выкарыстоўваюцца найшоўшыя тэхналогіі (як праекцыя ў «Таямнічым садзе» ў пастаноўцы Сашы Яфцімавай таго ж грузінскага тэатра), гэтае мастацтва ўсё роўна будзе заставацца вельмі жывым і эмацыянальным.

— Я ўзрадавалася, што падчас «Балетнага лета» ў Беларусі мы змаглі прычыніцца да святкавання 110-годдзя амерыканскага харэографа, заснавальніка неакласікі Джорджа Баланчына (асабліва таму мне прыемна, што паводле нараджэння ён Баланчывадзэ), — адзначыла Ніна Ананіяшвілі. — Мы танцавалі «Моцарціяну», адзін з апошніх яго балетаў. Радуе, што ў вас у тэатры ёсць яго Серэнада». Таксама я вельмі ўзрадаваная, што ў рэпертуары балетнай трупы беларускага Вялікага тэатра з'явіўся Кіліян, яго «Шэсць танцаў». Гэта было маё ўмяшанне: даўно сябрую з Іржы Кіліянам. Мне першай ён даў дазвол на выкананне сваіх балетаў на постсавецкай прасторы. І я вельмі хацела, каб вашы артысты мелі магчымасць танцаваць гэта. Калі ў рэпертуары тэатра з'яўляюцца імёны такіх харэографаў, гэта сведчыць пра высокі ўзровень трупы, пра што ва ўсім свеце тут жа ўсе даведваюцца. Балетны свет вельмі маленькі, і інфармацыя распаўсюджваецца хутка. Гэта дадае вашаму тэатру славы і правакуе цікавасць да яго.

Трэба прызнаць, што і сама Ніна Ананіяшвілі амаль што «прапісалася» ў Беларусі: удзельнічае ў пастаноўцы балета. Але няхай гэта будзе сюрпрызам у новым тэатральным сезоне.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# З «СЯБРОЎ» — У АМФІТЭАТР,

## або Чаму патэнцыйны дырэктар багатага прадпрыемства «прамяняў... хімію на музыку»?

**З гэтым абаяльным, інтэлігентным чалавекам, які кіруе калектывам працаўнікоў Летняга амфітэатра, многія «зоркі» мастацтваў вітаюцца за руку. Але наўрад ці яго ведаюць у твар гледачы самай вялікай у Еўропе канцэртнай залы. Цікава, што Анатоль ВАСЕНДА ў складзе ансамбля «Сябры» як музыкант выканаў на самым першым «базары» мастацтваў песню «Гуляць дык гуляць». Каб пагутарыць з Анатолем Іванавічам, прыйшлося разоў пяць пераносіць сустрэчу, бо ён заўсёды вельмі заняты. Загадчык філіяла «Летні амфітэатр» Цэнтра культуры «Віцебск» нават падчас нашай гутаркі перыядычна вырашаў самыя розныя арганізацыйныя пытанні.**
**Але, як потым высветлілася, размова з ім каштавала журналісцкага цярпення. Пагаварылі не толькі пра амфітэатр, «базар», але і пра армію, каханых, дзяцей. У яго іх шасцёра — 3 сыны і 3 дачкі!**
**І з усімі — самыя цёплыя і шчырыя стасункі.**


Анатоль Васенда з жонкай і дзецьмі.

### «НА ПЕРШЫЯ ГАНАРАРЫ КУПІЛІ АДНОЛЬКАВЫЯ ДЖЫНСЫ»

Калі б Анатоль Іванавіч не расказаў мне, што ён нарадзіўся ў Карэліі, а потым доўгі час пражыў на Гомельшчыне, думаў бы — з Адэсы. Калі расказвае нешта, нават пра асабістае, жартуе. Летась споўнілася 20 гадоў, як ён працуе ў Цэнтры культуры «Віцебск». Старэйшая сястра на сваю першую зарплату купіла мне гітару, а раней бацька падарыў гармонік. На гітары даволі хутка навучыўся іграць, не ведаючы нот. Дапамаглі асвоіць інструмент хлопцы, якія ўжо igралі. Бывае, і цяпер «балуюся» на гармоніку. Калі-небудзь выканаю вам нешта з рэпертуару «Бітлз» або «Назарэт».

Першыя грошы на музыцы Анатоль Васенда стаў зарабляць яшчэ ў школе.

— Мы з хлопцамі не толькі ў школе выступалі, але і ў так званай «клетцы» — так у савецкія гады называлі вулічныя танцпляцоўкі. Эля Ягораўна Сулімская, наш класны кіраўнік, якраз насупраць жыла і з балкона бачыла нас. Сказала, што ніякія апраўданні не здаць экзамены не будуць прымацца. Здалі! А на першыя ганарары мы ўсім квартэтам купілі сабе аднолькавыя джынсы і кашулі.

Пасля школы не паступіў у політэхнічны інстытут на машынабудаўнічы факультэт. Каб год не губляць, побач на праспекце Кастрычніка здаў дакументы ў вучылішча хімікаў №79. Калі скончыў яго з адзнакай, усё-такі паступіў у тую ВНУ, у якую хацеў,— расказвае Анатоль Васенда.

Падчас службы ў арміі ён амаль што не трапіў на вайну.

— Нам на вучэбнай базе «Пухавічы» выдалі скураныя рамяні, а ў савецкі час гэта значыла, што адправяць за мяжу. Думаў, што ў ГДР ці Польшчу. У мінскім аэрапорце зразумеў, што паляцім зусім у іншы бок — у Туркменію, а побач — Афганістан. Я туды і трапіў бы, калі б не прастудзіўся ў спякотным клімаце. Скразнякі былі ў памяшканні, дзе мы вывучалі тэорыю. Спачатку, калі я ўвесь пажаўцеў, думалі, што жаўтуха. Толькі ў бальніцы выявілі плеўрыт. Праз два месяцы прыехаў на ранейшае месца службы і... ні палатак, ні людзей. Я зразумеў, што хлопцаў адправілі ў Афганістан. Тры разы пісаў рапарты, але з-за перанесенай хваробы мне адмаўлялі. Быў у арміі і камандзірам аддзялення, у сакрэтнай часці паслужыў.

### А МОГ СТАЦЬ ДЫРЭКТАРАМ ПРАДПРЫЕМСТВА

Пасля арміі Анатоль працягнуў вучобу на вячэрнім аддзяленні ВНУ і працаваў на хімічным заводзе. Заробак там быў добры, кіраўніцтва вельмі цаніла адказнага работніка. Анатоль Іванавіч тады займаў пасаду старэйшага інжынера аддзела камплектацыі. Музыкант сабраў калектыў аднадумцаў, з'явіўся ансамбль. Завод заплаціў за вельмі добрае на той час абсталяванне для правядзення канцэртаў. Выступалі на прадпрыемстве, у Гомелі і не толькі. І заўсёды пад бурныя апладысменты публікі. Дырэктар завода, Уладзімір Сцяпанавіч Стральчонак, літаральна маліў Анатоля Іванавіча не звальняцца. Маўляў, ды іграй ты колькі хочаш у вольны час, падтрымаем: з цябе добры кіраўнік завода будзе, і гэта — мінімум, а максімум...

— А тады (здаецца, гэта быў 1988 год) прынялі першы закон аб кааперацыі. Мы гэтым па-добраму скарысталіся, каб зарабляць на музыцы. Атрымала падтрымку мая ідэя — стварыць кааператыў. Вядома, былі патрэбны грошы на інструменты, абсталяванне. Дык мне даверылі атрымаць крэдыт на проста фантастычную па мерках сярэднестатыстычнага грамадзяніна СССР суму — 65 тысяч рублёў! Тыя грошы, памятаю, у двух чамаданах-«дыпламатах» неслі. Купілі гукавую апаратуру, аўтамабіль, музычныя інструменты. На заводзе ўсё, што трэба было, абсталявалі ў фургоне, пачалі ездзіць на гастролі.

Кааператыў і рок-група называліся аднолькава — «Саюз». Праграма мела назву «Ад 70 і маладзейшым» — песні на розны густ. Мы самі пісалі музыку і вершы. На жаль, не ўсе вытрымалі выпрабаванне папулярнасцю, грашыма і пачалі ленавацца. На тым кааператыў і скончыўся. Але я цалкам разлічыўся за крэдыт, — успамінае Анатоль Васенда.

### ДВА АНАТОЛІ ІВАНАВІЧЫ І... МУЗЫ!

Пасля кааператыва ў творчым жыцці майго героя наступіла расчараванне. Даў ён сабе слова больш ніколі прафесійна не займацца музыкай. Але куды збяжыш ад лёсу? Запрасілі Анатоля Іванавіча працаваць мастацкім кіраўніком у вучылішча электратэхнікі №81. І да гэтага часу здзіўляецца таму, што сярод будучых электрыкаў, электраманцёраў знайшліся вельмі адораныя хлопцы. Так камандай сыграліся добра, што іх паслухаць пажадаў Анатоль Іванавіч Ярмоленка. Толькі пачалі выконваць другую песню — сказаў, што хопіць: яго, Анатоля Васенду, запрашаюць у «Сябры».

— Я ўвесь былы СССР аб'ездзіў з «Сябрамі». І на першы «базар» таксама прыехаў у якасці бас-гітарыста, — працягвае Анатоль Іванавіч.

Не мог падчас нашай гутаркі не запытаць пра ролю кахання ў творчым жыцці. Анатоль Васенда прызнаўся, што менавіта дзеля кахання ў свой час ён вырашыў больш не гастраляваць. Знайшоў разуменне ў Анатоля Ярмоленкі, які сказаў, што для яго заўсёды знойдзецца месца ў «Сябрах».

— Калі мужчына і жанчына сыходзяцца, а потым ім нешта непераадольнае перашкаджае ў сумесным жыцці, лепш разам не жыць далей. Але трэба захоўваць паважлівыя адносіны і заставацца прыкладам для дзяцей, каб яны не адчувалі недахоп у выхаванні. Я шчаслівы, бо ўсе мае дзеці нарадзіліся ў каханні. Маю трох сыноў і трох дачок. Старэйшай дачцэ 32 гады, а малодшаму сыну 5 гадоў восенню споўніцца, — з цеплынёй расказвае Анатоль Іванавіч.

### ДЗЕ Я, А ДЗЕ ШАГАЛ?

Пераехаўшы ў Віцебск, Анатоль Іванавіч месяцы два шукаў працу. Зайшоў і ў амфітэатр, дзе выступаў аднойчы. Ды сказалі, што ў яго паслугах не маюць патрэбы. Потым выпадкова пазнаёміўся з тагачасным кіраўніком аддзела культуры гарвыканкама Віктарам Кібісавым, які прадставіў яго Радзівону Басу. Дзве прапановы атрымаў: або культурна-спартыўны комплекс амфітэатра, або філіял аддзела культуры — цяперашні музей Марка Шагала. Анатоль Іванавіч жартуе: «Дзе я, а дзе Шагал?». Вырашыў, што першы варыянт яму бліжэй да душы.

— Мне часта шанцавала вучыцца ў добрых людзей. Вельмі дапамог Віктар Серафімавіч Аненкаў, які працаваў інжынерам у Летнім амфітэатры. Пасады загадчыка філіяла тады не было. Ён, выслухаўшы мае перажыванні наконт таго, што я, творчы чалавек, не змагу займацца гаспадарчай працай, проста пацікавіўся, колькі ў мяне дома лямпачак, замкоў? «Дык тут тое самае, толькі шмат!» Я многаму навучыўся ў Аненкава і ўрэшце атрымаў прапанову ад Радзівона Баса (былы дырэктар «Цэнтра культуры «Віцебск» і дырэкцыі фестывалю. — **Аўт.**) стаць «галоўным» у амфітэатры, — расказвае Анатоль Іванавіч.

### «ЦЯЖАРНЫ» АМФІТЭАТР І МЭБЛЯ... ПРАЗ ВОКНЫ

Адказваючы на мае пытанні, Анатоль Іванавіч сказаў, што, дзякуй Богу, падчас канцэртаў жанчыны не нараджалі. А сам амфітэатр... так! Ён мае на ўвазе тэрмін — прыблізна 9 месяцаў, калі ў 2007 годзе над амфітэатрам будавалі дах. Паралельна надбудавалі паверх для новых грымёрных, зрабілі крытай кавярню, да якой праклалі пешаходны мосцік. Ды яшчэ побач з'явілася выставачная зала «Духаўскі круглік», дзе цяпер знаходзіцца экспазіцыя, прысвечаная гісторыі фестывалю.

— Гэта пра цяжарнасць амфітэатра, безумоўна, жарт. Але ж насамрэч усяго за 9 месяцаў была праведзена фантастычная праца. Я добра памятаю ўсе этапы рэканструкцыі. І такое цудоўнае дзіця «нарадзілася»! А ўсё пачыналася ўвосень, людзі працавалі ў некалькі змен. Смешна цяпер успамінаць: каб мэблю ўсталяваць у грымёрных, мы яе — спачатку ўверх на пад'ёмніку, а потым праз вокны засоўвалі. У глядзельнай зале амфітэатра замест былых 4,6 тысячы месцаў пасля рэканструкцыі стала каля 6,2 тысячы, — працягвае Анатоль Васенда.

Паводле яго слоў, сярод «зорак» ён не шукае сяброў. Але вельмі цёплыя стасункі ў яго склаліся з Аляксеем Глызіным. Яны нават нарадзіліся ў адзін дзень — 13 студзеня.

Што тычыцца «зорных» гісторый і казусаў. Усе, напэўна, памятаюць як Баскаў у зале пашкодзіў нагу, П'еха — у атэлі, але выйшла на сцэну амфітэатра. Хтосьці і цяпер носіць пінжак Льва Лешчанкі. А балгарскі «зорны» выканаўца Бісер Кіраў, калі пераапранаўся за сцэнай, не знайшоў туфель. І дзе ён? Шукаюць і зараз.

Наконт перспектыў. Побач з амфітэатрам на пляцоўцы з тэніснымі кортамі плануецца ўзвядзенне забаўляльнага цэнтра з катком, які будзе адкрыты і летам. Анатоль Васенда верыць, што гэтыя і іншыя цудоўныя ідэі будуць рэалізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Кінакрокі

# Мода на Чэхава,

## ці Чаму чэхаўскія матывы ў кіно апрыёры цікавыя

**На кінастудыі «Беларусьфільм» знялі карціну «Прадмет абажання». Задзейнічаны Антон Паўлавіч Чэхаў, антураж XIX стагоддзя і сіла фатальнай жанчыны. Спалучэнне інтрыгуе. Дададзім чэхаўскую цынічнасць, сюжэтныя хітраспляценні, красуню ў галоўнай ролі і страсці, страсці, страсці...**

Карціна заснавана на некалькіх творах Чэхава: «Чайка», «Тры сястры», «Жывы тавар», «Дзядзька Ваня» і «Цугцванг». Сінтэз пераўтварыўся ў своеасаблівы дэтэктыў XIX стагоддзя. У гэтым дэтэктыве ёсць і самагубства, і турма, і вар'яты — усё з-за жанчыны.

Спачатку карціна называлася «Цугцванг» (у шашках і шахматах гэта становішча, любы ход з якога прывядзе да пагаршэння пазіцыі). Назву вырашылі змяніць, таму што «палова супрацоўнікаў кінастудыі не магла яе вымавіць» *(жарт дырэктара).* Кінематаграфісты, як адзначыў дырэктар «Беларусьфільма» Алег Сільвановіч, імкнуліся перадаць атмасферу чэхаўскай прозы.

Міжрадкоўе літаратуры Чэхава — складаны матэрыял для кінематографа. Так, проза Антона Паўлавіча вядомая сваёй прастатой і кароткасцю, уменнем у малым аб'ёме расказаць пра многае, некалькімі штрыхамі ствараць паўнавартасны вобраз, ёміста і справядліва апісаць усе грані чалавечай натуры. Нашай натуры: як бы ні пагарджалі мы тым, пра што чытаем, часам, гідкім і подлым (разам з прыгожым, сапраўдным, чыстым) — усё гэта частка нас саміх. Непрыемнае, але і прыгожае. Вартае, але і нізкае.

Нізкае. Калі мы да яго не маем дачынення, усё роўна неабыякавыя. Яно рассейваецца ў жыцці вакол, у прыродзе знаёмых людзей, у размовах на кухні. Чэхаў пісаў пра гэта наўпрост і «ў лоб», прозай халоднай назіральнасці, з'едлівасці, цынічнасці.

Але кароткасць кароткасцю, а як перадаць вялікі сэнс маленькай прозы? З якога боку да такой літаратуры падысці кінематаграфістам? Што варта ўзяць ад яе і ці можна ганарыцца адсылкамі да Чэхава?

Да таго ж Чэхаў сёння не тое каб папулярны (бо ён заўсёды «ў трэндзе»), але патрапіў у нейкую тэндэнцыю. Людзям падабаецца пафранціць цытатай Чэхава (бо Чэхаў!). Пра «ўніверсітэт развівае глупства», «у чалавечым шчасці ёсць нешта сумнае», «справа не ў песімізме і аптымізме, а ў тым, што ў дзевяноста дзевяці са ста няма розуму». Прадзімае безнадзейнасць. Чэхаўская цынічнасць чамусьці прыйшлася даспадобы не інтэлектуалам — не, не пра іх, — і нават не псеўдаінтэлектуалам, а моднікам. Для некаторых амаль прэстыжна быць мізантропам, расчаравацца ў жыцці, страціць веру ў людзей (яны ж такія неразумныя і прыземленыя). Урыўкі з чэхаўскіх апавяданняў тут вельмі дарэчы. Таму пісьменнік выйшаў за рамкі інтарэсу з боку аматараў класічнай літаратуры.

Значыць, фільм паводле Чэхава павінен выклікаць цікавасць. Ад гэтага імені вее годнасцю, аўтарытэтам і патаемнай апорай тых, хто расчараваны (у чым, не важна).

У правінцыйную сядзібу князя Грахольскага прыязджае папулярны белетрыст Барыс фон Дыдэрыц. Князь з жонкай, дарослымі дачкой і сынам гасцінна прымаюць у сябе знакамітасць. Час ад часу ў госці заязджаюць і сябры сям'і, павятовы спраўнік працаголік Даніла Ахлапкоў і мясцовы доктар. Такая «тусоўка».

Але ў цэнтры ўвагі аказваецца не вядомы пісьменнік, а яго жонка — прыгажуня Ліза. Трэба сказаць, нарабіла яна спраў у гэтай вёсцы. Закахала ў сябе юнака Рыгора Грахольскага, сына князя. Адзін эпізод пачынае шэраг адкрыццяў для гледача: Ліза зашпільвае сваю сукенку ў спальні, а юнак побач пакутуе ад кахання. Далей — больш: глядач пачне разумець, чым гераіня займаецца ў гэтай вёсцы, акрамя мацыёнаў і катання верхам. Відавочна, яна не імкнецца захаваць вернасць свайму мужу.

Рыгор не заняў важнага месца ў жыцці Лізы. І вось у яго ўжо з'яўляецца прычына раўнаваць сваю палюбоўніцу да Ахлапкова, які зачараваны гэтай дзівосна прыгожай для правінцыі жанчынай. Шчадралюбная Ліза ўзяла і аднойчы прыйшла да яго ў спальню. Не проста так.

А тут з'явіўся яшчэ адзін канкурэнт — сам князь Грахольскі, чалавек стары, які ўжо дажывае свой век. Нягледзячы на ўзрост і рэпутацыю, і яго не мінула гэтая чаша: князь закахаўся як хлапчук. Прычым так горача і палка, што быў гатовы ахвяраваць дзеля жанчыны княжацкім капіталам. А Ліза забаўляецца, распыляецца, зводзіць з розуму то аднаго, то другога. То любіць, то глядзець не хоча.

«Садом і Гамора», — скажа заўзяты мараліст.

> **У гэтым дэтэктыве ёсць і самагубства, і турма, і вар'яты — усё з-за жанчыны.**

«Яна спрабуе кампенсаваць абыякавасць свайго мужа», — сказаў бы дзядуля Фрэйд.

«Антыбуржуазны дэтэктыў», — скажам мы, разумеючы, што фільм такім не задумваўся.

А Барыс фон Дыдэрыц — упэўнены ў сабе, спакойны і поўны годнасці — адзіны мужчына, побач з якім Ліза займае прыніжанае становішча сваіх палюбоўнікаў. Так і жывуць да таго часу, пакуль красуня не знікае, што тлумачаць забойствам.

Як бы чаго не выйшла?

Выйшла. Варта паглядзець фільм, каб даведацца, хто з персанажаў застрэліцца, хто будзе арыштаваны, хто звар'яцее.

Зрэшты, да канца зразумець хітраспляценні сюжэта не атрымаецца, толькі — меркаваць. Застанецца загадкай, ці сапраўды жонка фон Дыдэрыца была забіта і ўвогуле ці была яму жонкай.



Можна паставіць пытанне і аб рэальнасці ўсіх дзеянняў, бо ў канцы фільма белетрыст прыходзіць са сваім расповедам да выдаўца. Ці была Ліза, Ахлапкоў, Грахольскія або гэта толькі пісьменніцкае ўяўленне — вырашаць самому гледачу.

Ці адчуваецца ў стужцы Антон Паўлавіч? Так, увесь Чэхаў — у нізкіх чалавечых страсцях, згубных інстынктах, патуранні сваім слабасцям, бездапаможнасцю перад непапраўнымі наступствамі. Фільм не мае нейкай маралізатарскай уласцівасці, і ў празаіка яе не было. Быццам бесстаронняя канстатацыя, высновы з якой павінен зрабіць сам глядач...

Фільм — ілюстрацыйны, у форме нейкай гульні з гледачом. На працягу карціны тонкім галаском шчабеча «фатальная жанчына», моцныя мужчыны становяцца слабымі, і ўсё гэта закручваецца ў хуткі вір, які не спыніць і не павярнуць у адваротны бок. Гульня прымае форму галаваломкі: рэальнасць тут арганічна спалучаецца з трызненнем, можа, сном, фантазіяй, марай. Паспрабуй зразумець...

Але гэты фільм не менш рэальны, чым сюжэты нашых кухонных размоў, чым тое, што мы бачым вакол сябе. Угледзьцеся ў персанажаў — і вось у іх можна ўбачыць грахі сучаснікаў, падзенне нораваў, уласныя слабасці, няхай і не настолькі гіпербалізаваныя. Гэта свет, у якім традыцыйная мараль аказваецца за бортам, але гэта як быццам не дрэнна, таму што ўсё могуць растлумачыць дзядуля Фрэйд і славутыя «абставіны».

Магчыма, фільм намякае: давайце, маўляў, вернемся да вялікіх этычных ісцін. А магчыма, з пункту гледжання маралі фільм аналізаваць не варта.

Можа, аўтары пасмейваюцца з чалавечых слабасцяў, а можа, горка пра іх шкадуюць.

Можа, гэта забаўляльны фільм з прэтэнзіяй на высакаякасную забаўку. А можа, гэта глыбокая праблемная карціна з заключэннем «выбірайце, што-небудзь шэранькае, пасрэднае, без яркіх фарбаў...» (пра жонку) або са спасылкай да нормаў маралі ізноў жа.

Напрыканцы не магу не звярнуцца да больш празаічных рэчаў. З пачатку фільма некаторыя фразы здаюцца напышлівымі і таму недарэчнымі. Тонкая манернасць у голасе галоўнай гераіні паступова прымушае канцэнтравацца толькі на яго раздражняльным тэмбры, а не на змесце сказанага. Прастытутка ў доме распусты, якая іграе на фартэпіяна, занадта відавочна бязладна клацае па клавішах.

Але дробязі не павінны перашкодзіць спробам разабрацца ў карціне. Разгарніце томік Чэхава (будзьце ў трэндзе), паглядзіце «Прадмет абажання», паразважайце пра мараль, прыгажосць і адзіноту закаханага чалавека.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Пасля падзеі

# ПОСПЕХ ВЫЛІЧАЕЦЦА Ў ТЫСЯЧАХ

## Калі б хапала плошчы, выставу «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» варта было б пакінуць у пастаяннай экспазіцыі

**10 ліпеня выстава «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі», якая працягвалася чатыры месяцы, закрылася. За гэты час было прададзена каля 14 тысяч квіткоў, яшчэ каля 40 тысяч чалавек змаглі ўбачыць выставу разам з агульнай экспазіцыяй і падчас акцыі «Ноч музеяў».**



Было замоўлена каля 300 экскурсій, а ў гасцявой кнізе засталося больш за 700 водгукаў.

Частка экспазіцыі будзе паказана ў Вільні. Акрамя таго, выстава будзе прадстаўлена на вераснёўскім II Нацыянальным музейным форуме ў Гомелі.

— Гэты праект накіраваны на будучыню, на дзяцей і моладзь, якія павінны ведаць і ганарыцца сваёй гісторыяй. Мы рыхтавалі выставу два гады, і ў кантэксце юбілею — 75-годдзя музея — гэта самая важная падзея года, а можа, і не аднаго. Калі б хапала плошчы, варта было б пакінуць праект у якасці пастаяннай экспазіцыі, — адзначыў дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў.

Выстава была адзначана не толькі наведвальнікамі, яна атрымала прызнанне і на прафесійным узроўні. Міжнародны фестываль тэрытарыяльнага маркетынгу і брэндынгу OPEN вызначыў яе пераможцам у намінацыі «Культурны праект».

На XI Міжнародным конкурсе «Мастацтва кнігі» Гран-пры атрымаў каталог выставы «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі».

Выстава змясціла ў сябе каля 500 экспанатаў, пачынаючы з часоў Візантыі да сучаснасці з 29 музеяў рэспублікі, прыватных і карпаратыўных калекцый.

Асаблівую цікавасць у аматараў беларускага мастацтва выклікалі ўнікальныя для калекцыі творы, упершыню прадстаўленыя ў Беларусі: карціна Хаіма Суціна «Ева», набытая Белгазпрамбанкам на аўкцыёне Sotheby's за 1 млн 860 тыс. долараў, праца Валенція Ваньковіча «Партрэт паэта Тамаша Зана» — адзіны вядомы сёння партрэт паэта, выкуплены ў расійскага калекцыянера. Наведвальнікі выставы ўпершыню змаглі ўбачыць кнігу Сімяона Полацкага «Жазло праўлення», выдадзеную ў 1667 годзе, карціны Марка Шагала і многае іншае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

Усё пра Еву



■ З прысмакам экстрыму

# ХАДЗІЦЬ НАЛЕВА — САБЕ ДАРАЖЭЙ!



## Не проста нялёгка — гэта цэлае мастацтва, таму без спецыяльнай падрыхтоўкі лепш не рызыкаваць

**Гэты артыкул не з'яўляецца спробай прапагандаваць хаджэнне налева. Аўтар не ставіў мэтай разбурэнне інстытуту сям'і. Падчас падрыхтоўкі артыкула ніхто з жанчын не пацярпеў.**

### НЕ ЎПЭЎНЕНЫ — НЕ ПАЧЫНАЙ!

Насамрэч, калі б усе мужыкі, якія хаця б раз схадзілі налева, скінуліся, атрымаўся б помнік каханцы з чыстага золата, а вочы той скульптуры — з алмазаў. Адразу ўспомніў пра Надзю з вядомай камедыі «Іронія лёсу, або З лёгкай парай». Памятаеце, яна расказвала Жэню пра тое, што «была замужам напалову», бо па выхадных і на святы яе «муж» бавіў час са сваёй сям'ёй... Бачу гэты помнік: сядзіць жанчына ля тэлефона і чакае. Можна і з мабільным у руцэ, улічваючы, што ў наш час мабільным карыстаюцца часцей, чым «праваднupым» тэлефонам.

Каюся, здраджваў сваім грамадзянскім жонкам. І зусім не таму, што натура такая — здрадніка ў каханні. Проста калі твая «палова», няхай і грамадзянская, не мае рацыі, «піліць» амаль штодня, «выносіць мозг» з-за кожнай дробязі і пастаянна паўтарае магічную фразу: «Трэба больш зарабляць, вось у сяброўкі муж...», дык не пайсці налева — сябе не паважаць. Шчыра скажу: калі б нехта з маіх былых жанчын мяне шчыра кахаў і разумеў, што грошы зарабляць, безумоўна, трэба, але ёсць нюансы, бо не ўсім жа дадзена нарадзіцца прадпрымальнікам — стрымліваў бы сябе ад здрады, як мог.

А так... Як не пайсці налева, калі ты прыходзіш дадому цвярозы, а твая «палова» заяўляецца ў такім стане, што закусваць хочацца ад паху? А некаторыя дамачкі спачатку дома не начуюць, а потым тыдзень выпытваюць: чым жа ты там займаўся, пакуль мяне не было? Ужо прабач, даражэнькая!

Быў, праўда, выпадак, калі я амаль што папаўся: нечакана патэлефанавала «мая», каб нешта там у краме купіў, а я ў гэты час быў у іншай... Парада мужчынам: каб не «спаліцца», патрэбна жалезнае алібі! Імправізацыі змогуць адыграць злы жарт. Ужо калі рыхтуешся пайсці налева, загадзя напружся і прыдумай вельмі праўдзівую версію. А тлумачэнні наконт таго, што «сябар папрасіў пад'ехаць дапамагчы», або «тэлефон сапсаваўся» пакінь для дзевяцікласнікаў.

### КОШТ ЗДРАДЫ

Сустрэў выпадкова прыяцеля, які нечакана паскардзіўся: маўляў, дорага абыходзіцца каханка. Мінімум 300 долараў у эквіваленце вылятаюць штомесяц на шампанскае, кветкі, падарункі і г.д. Па логіцы, калі ты «не цягнеш» утрымліваць сям'ю і каханку адначасова, дык ёсць сэнс адмовіцца хаця б ад каханкі.

> **Калі б нехта з маіх былых жанчын мяне шчыра кахаў і разумеў, што грошы зарабляць, безумоўна, трэба, але ёсць нюансы, бо не ўсім жа дадзена нарадзіцца прадпрымальнікам — стрымліваў бы сябе ад здрады, як мог.**

Няма чаго граху таіць, многія каханкі наўмысна «выпампоўваюць» грошы з мужыкоў. Ёсць і такія, якім сумы на ўзроўні сярэдняй па краіне зарплаты ў якасці «ўзнагароды» за сустрэчы будзе мала. Каханнем такія стасункі назваць цяжка. Дык навошта, калі задумацца? Ці не прасцей і не танней сустракацца... з прафесіяналкай? (Маю на ўвазе жрыц кахання.) У іх хоць «такса» фіксаваная (у сярэднім 40 умоўных адзінак за гадзіну. — **Аўт.**). І яны не будуць вам бясконца «капаць на мозг».

Вось майму калегу пашанцавала: некалькі гадоў таму ён пазнаёміўся на адпаведным сайце з адной дамай. Паколькі людзі яны дарослыя, адразу дамовіліся, што, акрамя сексу, іх нічога звязваць не будзе. Улічваючы, што абое вельмі занятыя — перыядычна проста сустракаюцца... Праўда, дама перыядычна імкнецца ажыццявіць сваю мару — удала выйсці замуж. Таму, бывае, па 6-7 месяцаў яны могуць не сустракацца. У яе чарговае расчараванне — і зноў сустрэча з ім. Шчаслівы! Ёсць чаму зайздросціць!

А цяпер без жартаў: лячыцца ад пікантных хвароб, якія падчапіць — раз плюнуць, не толькі непрыемна, але і дорага. І, паверце, вы наўрад ці ўтоіце гэты факт ад жонкі. Таму загадзя паклапаціцеся аб бяспецы, купіце ў аптэцы прэпарат, які можа абараніць ад хваробы. Хаця заразіцца можна нават падчас страснага пацалунку — памятайце пра гэта!

Наўрад ці знойдзецца шмат мужчын, якія пагодзяцца, каб іх жонкі таксама хадзілі налева. А вы, паважаныя калегі «па поле», не задумваліся аб тым, што, калі вы ў каханкі, ваша жонка можа быць у суседняй кватэры — у каханага? Літаральна як у фільме «Не можа быць!» Ды можа!

Між іншым, некаторыя жанчыны настолькі тэмпераментныя, што колькі іх ні просіш, як пацалуе якая або як падрапае, дык трэба жонцы быць поўнай дурніцай (або вельмі мудрай жанчынай), каб гэта не заўважыць...

Парада мужчынам: перад сустрэчай прасіце каханак, каб не карысталіся духамі, каб стрымлівалі свае эмоцыі, каб не вельмі фантазіравалі падчас інтымнай сустрэчы: без усякага там пакусвання і іншага.

### ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

А ўвогуле, калі разабрацца, дык у хаджэння налева ёсць толькі адзін плюс: секс з прысмакам экстрыму.

Мінусаў жа магу пералічыць з дзясятак.

1. Каханка — «істота» ненадзейная, бо можа знайсці сабе іншага, выйсці замуж.

2. Яна можа аднойчы паставіць пытанне рубам: маўляў, або я, або твая сям'я.

3. Каханка можа зацяжараць. І не факт, што ад цябе.

4. У любым выпадку спатрэбяцца дадатковыя грошы — на падарункі, здымную кватэру.

5. Каханка вельмі лёгка можа «здаць» цябе. У любым выпадку яна расказвае пра свайго мужчыну сяброўкам.

6. Каханка аднойчы папросіць вас правесці з ёю выхадны дзень, свята. Яшчэ горш — калі скажа пра сумесны водпуск.

7. Каханка можа ў любы момант «сарвацца» і настолькі страціць кантроль над сваімі дзеяннямі, што ваш мабільны будзе «разрывацца» ад яе званкоў і паведамленняў.

8. А здароўя вам хопіць на дваіх? Раптам, бац — і не захочацца ні жонкі, ні каханкі! Хаця ў гэтым мінусе ёсць плюс: можа, урэшце, пачняце весці здаровы лад жыцця, кінеце курыць, злоўжываць гарэлкай.

9. Каханка можа вам надакучыць. Вы будзеце шукаць новую, а з мінулай яшчэ не разарвалі стасункі, плюс жонка... Сілы хопіць, каб перажыць гэты няпросты час?

Калі ўжо разважаць на тэму здрады, дык насамрэч напрошваецца выснова: а ці трэба? Вядома, сумеснае жыццё, на жаль, для многіх становіцца абузай ужо праз некалькі гадоў. Але дзе гарантыя, што і каханка не стане «двайніком» жонкі? Карацей, пытанняў тут больш, чым адказаў.

**А.П., «хадок» са стажам**

■ Паміж намі

# ПАЧЫМ «АПРАВА» ДЛЯ «БРЫЛЬЯНТА»?

**Ну што ж гэта такое? На які сайт ні зайдзі, адусюль нясуцца стогны незадаволеных жанчын: маўляў, мужыкі нармальныя пераводзіліся, замуж выходзіць няма за каго. А тых, за каго можна было б, самы час заносіць у Чырвоную кнігу, бо выміраюць як від...**

Не спрачаюся: мужчыны — не анёлы. Але каб вось так, пагалоўна, усіх ганьбіць... Вы б, дзяўчаты, спачатку вызначыліся, якія мужчыны вам патрэбны, канкрэтызавалі б, так бы мовіць, свае патрабаванні, зыходзячы з рэальнасці. А то пішаце: «Пазнаёмлюся з добрым, чулым, клапатлівым маладым чалавекам, які ў стане забяспечыць дастойную «аправу» такому брыльянту, як я!» Вы што, з Месяца зваліліся? Ці наглядзеліся галівудскай лухты пра тое, як закаханы па вушы мільянер дзеля заваявання беднай бязроднай прыгажуні (мары ўсяго свайго жыцця) упадае ці то ў дзяцінства, ці то ў маразм і пачынае направа — налева раскідвацца палацамі, каштоўнасцямі, заводамі, параходамі... Потым лезе да каханай на балкон па вадасцёкавай трубе (абавязкова ў касцюме ад Версачэ) і кідае да яе ног сваё сэрца і апошнія мільярды...

Усё гэта, безумоўна, кранае да слёз, але даверу не выклікае. Тут або грошы, або крэслы. Або мільёны на рахунку, або высакароднае сэрца і клопат пра блізкага (пра каханую ў нашым выпадку). І не лічыце мяне жорсткай, таму што я ўжо крыху ведаю гэты свет. Грошы, як вядома, не звальваюцца на мужчыну з неба. Іх трэба зарабіць. Рукамі, мазгамі, потам, а часам нават і крывёю — бывае па-ўсякаму. Чым больш грошай, тым большая аддача ад самога сябе. Здараецца, на карту ставіцца ўсё — годнасць, гонар, сумленне... У моцных і ўдачлівых мужчын сэрца з цягам часу цвярдзее, перастае рэагаваць на мальбу, плач, іншыя праяўленні «слабасці»... Не тое што ўсё чалавечае становіцца для іх іншародным... Проста ад сваіх партнёраў і аднадумцаў (у тым ліку і ад сваіх жанчын) яны чакаюць гэткай жа аддачы і вытрымкі. Так што не спадзявайцеся на празмерныя «сюсі-пусі», калі раптам адчуеце сябе адзінокай у бясконцых лабірынтах яго кватэры. Вы ж самі выбралі такую «аправу» для «брыльянта», а яна вырабляецца з вельмі цвёрдых парод.

Што ж датычыцца мілых хлопчыкаў, наіўных рамантыкаў і іншых чалавекалюбівых істот мужчынскага полу, то ў іх кішэнях, як паказвае жыццё, звычайна вецер свішча, а ў халадзільніку мыш ад нуды павесілася. Або, гаворачы бухгалтарскай мовай, штомесячная зарплата эквівалентная сярэднестатыстычнай па краіне... Ён, наш рамантык, сапраўды сумленны і добры, таму што працуе пераважна не за грошы, а за ідэю (прафесія падабаецца). І пачуцці ў яго шчырыя, і мары ўзвышаныя. І ў сапраўднае каханне ён па-ранейшаму, нягледзячы ні на што, верыць, і разумення шукае, і цяпла, і пяшчоты... Ён з задавальненнем дарыў бы кветкі каханай хоць кожны дзень, але колькасць «у.а.» у месяц абмежаваная, а камунальныя паслугі даражэюць...

Так што, дзяўчаты, вызначайцеся, з кім вам па жыцці ісці. Каб не было потым пакутліва балюча — ні вам, ні таму, хто побач...

Колькі гадоў таму адна мая прыяцелька, якая таксама прагла вялікага і чыстага кахання, пазнаёмілася з «прэзентабельным» мужчынам, які меў, да таго ж, самыя сур'ёзныя намеры. Прывёз ён яе ў сваю чатырохпакаёвую кватэру, дазволіў там жыць, пазнаёміў з сябрамі, даверыў ключы ад машыны... Праз некалькі месяцаў яна ўжо складала спісы неабходных (для яе) рэчаў і ўчыняла скандалы з нагоды яго «матэрыяльнай нікчэмнасці». Прынц, бач ты, аказаўся «голым». Хоць і кахаў, і аберагаў, і нават вершы ёй прысвячаў... Але недацягнуў па іншых параметрах. Давялося развітацца. Да гэтага часу інакш як фінансавым імпатэнтам яна свайго «былога» не называе.

Так што нічым вы, дамачкі, не лепшыя за мужыкоў. Магчыма, апошнія вас часам «купляюць» і «выкарыстоўваюць», але ж і вы пагаджаецеся на гэта, прычым добраахвотна, без прымусу. А потым скуголіце: «Гэтая «жывёліна» зусім мяне не паважае!..»

**Ала БЫВАЛАВА**

■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА,**
**галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**



# НЕ ПЕРАБЛЫТАЦЬ...

Магнітны пропуск Дома прэсы ў метро не спрацоўвае... Як аказалася. Дамафон на ўвядзенне пін-кода ад банкаўскай карткі... рэагуе, але неадэкватна. Чамусьці. Адказваць на Яго званок традыцыйным: «Часопіс «Маладосць» слухае. Добры дзень!» — не тое каб дзіўнавата, але не лагічна — гэта дакладна.

Зрабіць такія высновы мяне прымусіла адсутнасць адпачынку. Ну, проста я доўга збіралася. Таму што чакала Яго. Усялякае чаканне ўзнагароджваецца: я дачакалася — і нават зрабіла, як бачым, адкрыцці. Няхай яны і так сабе, і практычнай карысці ад іх хіба толькі старэнькім суседкам, што сядзяць па вечарах на лавачцы каля пад'езда. Але брытанскія навукоўцы — не можа быць, каб не пазайздросцілі. Цікава, якія высновы зрабілі б яны з маіх высноў? Якімі аргументамі, дасціпнымі і трапнымі (як заўсёды ў брытанскіх навукоўцаў) яны ўдарылі б па гэтых цалкам праверанных мною фактах? Факт — гэта ў нейкім сэнсе і аргумент таксама. Той факт, што Яго, майго мужа, не адпусцілі ў адпачынак тады, калі гэтага захацелася мне, — відавочна, з'яўляецца аргументам на карысць наяўнасці змовы. Так, так, гэта змова. Змова ценяў. Я — Анжэліка, маркіза анёлаў, і гэта змова — супраць мяне. А я — не супраць...

Ну, найперш таму, што ўзнагароджваецца не толькі чаканне: за працу праз «не магу» таксама сёе-тое патрабуецца. Вельмі шкодна, як казала адна знаёмая фея, не ездзіць на баль, калі ты гэтага заслугоўваеш. Я феі веру безумоўна, тым больш што гэта фея — мой асабісты псіхолаг. Самы цудоўны псіхолаг у свеце. Яна просіць пісаць на шпалерах сваёй кватэры пажаданні (простым маркерам колеру слівы-венгеркі!) і частуе за гэта лепшай у свеце гарбатай... Неяк ад яе пачула, ЯК на самой справе трэба працаваць. Аказваецца, рабіць гэта трэба так, каб у любы афіцыйна працоўны дзень, калі табе толькі ўздумаецца, можна было дазволіць сабе не рабіць анічогачкі — быццам за вокнамі твайго працоўнага кабінета не серада ці чацвер, а субота ці нават нядзеля. Суперпарада! Калі-нікалі карыстаюся (толькі не кажыце пра гэта майму дырэктару, добра?). Дык вось, шкодна не ездзіць на баль! Мы з Ім — едзем! Наш баль — падарожжа па месцах, куды не ступалі яшчэ нашы ногі.

— Па-першае, нас ужо даўно чакаюць у сядзібе Рэпіна ў Здраўнёве. Мне пра яе замовілі артыкул у «Легенду». Праўда, класна?

Не, напраўду класна: вось толькі я падумала, як добра было б пабачыць, што за дамок набыў сабе Ілья Яфімавіч за сваіх «Запарожцаў», як патэлефанавала былая дырэктара з просьбай: напішы, маўляў, пра Здраўнёва. Люблю такія супадзенні. Праз тыдзень едзем.

— Віцебскі архіў — гэта ж якраз па дарозе? Паглядзім там дакументы для аднаго артыкула пра Станюту?

— Яшчэ што?

Гэта Ён мне задае такое пытанне. Яшчэ што?

— А пракоцімся па Палессі, як Караткевіч некалі, яго маршрутам?! Атрымаецца артыкул для «палескага двухтомніка» «Маладосці». Нам жа ўсё роўна, як вандраваць...

Некалі, на самым пачатку працоўнага стажу, я была «застукана» начальствам за «крымінальнай» справай: гартала часопіс. Здаецца, «Бурду». Пасля таго выпадку сама сабе паклялася, што больш — ніколі! «Ніколі больш не буду на працы гартаць часопісы!» — сказала я сабе ўпэўнена і строга. Не я вінавата, што абяцанне стрымаць не ўдалося: Нехта Там нейкім чынам адно праз адно карэлюе. Абавязкі супастаўляе з жаданнямі, а магчымасці — з заслугамі. Прайшло не так шмат часу — і гартанне часопісаў стала маім штодзённым абавязкам. Відаць па ўсім, жаданым. Магчыма, я яго проста заслужыла.

Гэта нічога, што магнітны пропуск Дома прэсы не спрацоўвае ў метро. Галоўнае — не пераблытаць працу з адпачынкам.

■ Зрабі сябе сама

# Проста Марыя: ЯКОЕ Ў ВАС АПРАЎДАННЕ?

**У адзін момант 32-гадовая Марыя Канг з Лос-Анжэлеса (што ў Каліфорніі), шчаслівая жонка і маці траіх сыноў, стала славутай. Але зусім не таму, што вядзе свой фітнес-блог, піша артыкулы пра спорт і здароўе і з'яўляецца дырэктарам некамерцыйнай фітнес-арганізацыі.**




Проста не так даўно Марыя, жадаючы падбухторыць іншых матуль заняцца сваім знешнім выглядам, выклала ў сацыяльнай сетцы фота, на якім яна красуецца ў акружэнні траіх маленькіх сыноў. Усё б нічога, але Марыя для здымак надзела купальнік, які не хавае яе прыгожае, трэніраванае цела. Мала таго — у якасці подпісу пад гэтым фота змешчана пытанне: «А якое ў цябе апраўданне?», адрасаванае, як лёгка здагадацца, усім тым жанчынам, якія пасля родаў не дасягнулі такіх выдатных вынікаў у барацьбе з лішнімі кілаграмамі.

За вельмі кароткі час фота Марыі атрымала вялікую колькасць водгукаў, сярод якіх — мора негатыўных. «Для жанчыны зняважальна так зашмат думаць пра сябе! Агідна, што вы ёсць!» — абрынуліся на яе інтэрнэт-карыстальніцы, якія не могуць пахудзець, нягледзячы на дыеты і заняткі спортам.

«Людзі, якія размяшчаюць падобныя фотаздымкі, прымушаюць мяне плакаць! Пасля дзвюх цяжарнасцяў мая скура абвісла, і без пластычнай аперацыі я ніколі не буду выглядаць так, як вы,— піша Марыі адна з жанчын.— У чым маё апраўданне? У тым, што ў мяне няма такіх генаў, як у вас!».

Другая працягвае: «Паглядзела б я на вас, калі б вы працавалі на дзвюх работах, не мелі няньki і не былі б худой ад прыроды!».

Марыя не засталася абыякавай да падобных каментарыяў. Яна кажа, што, выстаўляючы фота, зусім не збіралася крыўдзіць поўных жанчын — наадварот, хацела іх натхніць. І дадае, што таксама змагаецца з генетыкай, працуе поўны рабочы дзень, спраўляецца з двума бізнесамі і не мае нянькі. «У тым, што вы такія, няма маёй віны, але ёсць ваша,— піша яна.— Вы самі зрабілі свае жыццё такім — з дапамогай сваіх думак, дзеянняў і рашэнняў. Не трэба апраўдваць лішнюю вагу мацярынствам. У мяне таксама абвісае скура пасля кожнай цяжарнасці, але гэта толькі падганяе мяне да новых перамог над сабой».

Марыя не збіраецца выдаляць свае фотаздымкі. Яна па-ранейшаму ўпэўнена, што сваім прыкладам зможа натхніць многіх жанчын пачаць даглядаць не толькі мужа і дзяцей, але і сябе.

**Алена ЗАРЭЧНАЯ**

■ Мора кліча!

# ВЫБІРАЕМ КУПАЛЬНІК,

## або Як схаваць недахопы фігуры пры мінімуме адзення

**Сезон водпускаў набірае абароты. Душа і цела прагнуць адпачынку на ўтульным марскім узбярэжжы. Для чароўнай паловы чалавецтва асабліва актуальным у гэты час становіцца пытанне: у чым купацца-загараць, ды так, каб з'явіцца на пляжы было не сорамна?**

Пры выбары купальніка стылісты раяць улічваць тып фігуры — «пясочны гадзіннік», «трохвугольнік», «перавернуты трохвугольнік», «авал», «прамавугольнік». Аднак у жыцці ў чыстым выглядзе такія тыпы сустракаюцца даволі рэдка, — існуюць змешаныя або пераходы паміж тыпамі фігур. Таму, падбіраючы купальны касцюм, не забывайце пра асаблівасці свайго целаскладу.



Сёлета ў трэндах — купальнікі-трыкіні.

Вядома ж, ідэальныя прапорцыі жаночай фігуры — гэта сілуэт, які паўтарае форму *пясочнага гадзінніка (васьмёрка)*. Жанчыны з такой фігурай могуць выбіраць любы крой купальнікаў. У гэтым сезоне варта звярнуць увагу на монакіні — больш адкрытую версію суцэльнага купальніка, якая выгадна падкрэслівае талію і форму грудзей. Верх эвалюцыі — купальнікі-трыкіні — вытанчаны саюз суцэльнага купальніка і класічнага бікіні. Аднак толькі ўладальніцы бездакорнай фігуры могуць дазволіць сабе такую модную рэч! Мадэлі трыкіні надзвычай сексуальныя. Праўда, ёсць адно «але»: лепш загадзя раўнамерна загарэць, каб потым цела не было «ўпрыгожана» рознымі палосамі, кольцамі і косамі.

*Трохвугольнік (груша)*. Гэты тып фігуры лічыцца самым жаноцкім. Вузкія, часта пакатыя плечы спалучаюцца з буйнымі, акруглымі клубамі. Бюст бывае сярэднім, жывот плоскім, а талія — добра выражанай.

У гэтым выпадку наша задача — зрабіць ніжнюю частку візуальна меншай, а фігуру ў цэлым — больш зграбнай. Для гэтага акцэнтуем увагу на грудзях. Напрыклад, надзяваем паасобны купальнік з пярэстым верхам і аднатоннымі плаўкамі. Другі варыянт — суцэльны купальнік, дэкарыраваны ў зоне грудзей і гладкі знізу. І яшчэ няхай плаўкі будуць з высокімі выразамі — так ногі здадуцца даўжэйшымі. Ураўнаважыць фігуру дапамогуць і буйныя каралі альбо брошка, прыколатая да станіка.

Жанчынам з маленькімі грудзямі варта звярнуць увагу на купальнікі-бандо (без шлеек) з цвёрдымі «чашачкамі» або станікі пуш-ап. Рэкамендуецца выбіраць станікі, упрыгожаныя брыжамі або банцікамі.

*Перавернуты трохвугольнік (морква)*. Тут усё наадварот, бо фігура «морква» — гэта вузкія клубы і шырокія плечы. А значыць, вам неабходна прыцягнуць увагу да нізу і паменшыць верхнія параметры. Адмоўцеся ад купальнікаў-



Вялікія «формы» могуць быць вельмі прывабнымі.

бандо. Пажадана, каб верх быў нейтральным, а вось для ніжняй часткі рэкамендуюцца ўсялякія рушы, завязкі па баках, кантрасныя дэталі, спаднічкі ці шорцікі.

Жанчынам з вялікім бюстам падыдзе купальнік з эластычнай шчыльнай тканіны, са станікам на «костачках». «Чашачкі» верху павінны быць глыбокімі і добра падтрымліваць грудзі. Лепш, каб у купальніка былі шырокія шлейкі (або адна шлейка вакол шыі) і засцежка з кручкамі ў два рады.

Калі вы ўладальніца фігуры ў форме *авала — «яблыка»* (асноўная частка вагі і аб'ёму знаходзіцца ў груднай зоне і на таліі), адкідайце прэч старамодныя бясформенныя купальнікі. Ваша задача — зрабіць фігуру візуальна больш стройнай, абазначыць лінію таліі і забяспечыць падтрымку грудзей. Спыніце выбар на злітных купальніках з V-падобным выразам, шырокімі шлейкамі і драпіроўкай.

Таксама вам падыдзе купальнік-танкіні (топ + трусікі) з дэталямі ў зборкі альбо купальнік з поясам, які акцэнтуе ўвагу на лініі таліі.

Дарэчы, купальнік-танкіні — ідэальны варыянт для будучых мам. Ён цудоўна прыкрывае жывоцік, але пры гэтым дазваляе загараць іншым часткам цела.

*Прамавугольнік (банан).* Калі ваша праблема — цела без выгібаў (гэта значыць, клубы, талія і плечы — усё аднаго памеру), то ваша задача зводзіцца да таго, каб надаць целу больш жаноцкі выгляд. Выбірайце для сябе купальнікі з яркім малюнкам, рушамі, аплікацыямі і іншымі «прыбамбасамі» для стварэння аб'ёму. Неабходна з дапамогай гэтых дэталяў зрабіць фігуру больш гарманічнай. Не варта спыняцца на злітным аднатонным купальніку, паколькі такая мадэль зробіць ваша цела яшчэ больш плоскім. А вось прымераць модныя трыкіні — можна і трэба. Дзякуючы мудрагелістым праёмам і скрыжаванням тканіны ў патрэбных месцах яны нададуць целу неабходныя выгібы і аб'ёмы.

### КОЛЕР-2014

А якія ж колеры купальнікаў стануць хітамі гэтага сезона? У модзе яркія, кідкія, насычаныя расфарбоўкі — фуксія, ультрамарын, аранжавы і г.д. Таксама не менш актуальныя белыя купальнікі (яны ідэальна падкрэсляць прыгажосць загарэлага цела) і чорныя (нададуць фігуры стройнасці). Стыльна будуць глядзецца класічны гарошак, клетка і гарызантальная палоска.

У трэндзе купальнікі з тканіны з імітацыяй пад скуру, а таксама мадэлі з яркімі прынтамі. Гэта могуць быць прынты як у анімалістычным стылі, так і разнастайныя малюнкі трапічных раслін, жывёл альбо марская тэматыка.

**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

■ На хвалі быцця

# НЕ ЗАБЫЦЦА ПРА ТАЛАКУ



**Я вырас у невялікім прыгарадным пасёлку, у якім жылі ў асноўным працаўнікі гаспадаркі, якая спецыялізавалася на вырошчванні саджанцаў пладова-ягадных дрэў і свежай агародніны. І хоць літаральна за некалькі дзясяткаў метраў ужо былі забудовы гараджан, лад жыцця жыхароў нашага пасёлка больш нагадваў вясковы. Да таго ж кожнай сям'і выдзяляліся ўчасткі для пасадкі бульбы і ўласных агародаў.**

Тады ўпершыню я даведаўся, што такое «талака». Талакой, калі збіраліся суседзі, садзілі бульбу, талакой капалі і збіралі яе ў бурты, перабіралі і ўпарадкавалі. Потым адзначалі дакопкі шумнай бяседай, з песнямі і доўгімі размовамі.

Увогуле, кантактавалі ў пасёлку паміж сабой і дзеці, і дарослыя, асабліва жанчыны. Мама часта гаварыла: «Пайду на сяло». Гэта азначала, што забяжыць да суседкі ды і затрымаецца там на гадзінку, абмяркоўваючы свежыя навіны.

Значна пазней, калі я атрымаў першую кватэру ў Наваполацку, мяне здзіўляла, што мы не ведалі нават тых, хто жыве на адным паверсе, не кажучы ўжо пра цэлы пад'езд дзевяціпавярховага дома.

Тое ж сталася і ў Мінску. На маіх вачах з нашага пад'езда, у якім усяго пятнаццаць кватэр, вырас хлопец, ператвараючыся спачатку ў падлетка, а пасля ў зусім дарослага дзецюка, які ні з кім не вітаецца, і я не ведаю нават яго імя.

Гэта, калі ўлічыць, што ў большасці сённяшнія гараджане — або былыя вяскоўцы, або жыхары невялікіх мястэчак — цэлая ментальная рэвалюцыя, калі народ мяняе свой традыцыйны ўклад, звычкі, адсюль — і мову.

Мае землякі заўсёды вызначаліся спагадай, жаданнем падзяліць з бліжнім яго клопат, паспачуваць, дапамагчы.

Памятаю, калі мне, малому, у дзіцячай гульні разбілі кавалкам цагліны галаву, а дома ў той час нікога з дарослых не было, суседкі абмылі і перавязалі, паслалі старэйшага хлопца-падлетка са мной у няблізкую паліклініку, дзе мне наклалі швы.

Сёння ж часцей за ўсё, калі мы ўбачым на вуліцы такую карціну, то многія проста пройдуць міма, не звярнуўшы ніякай увагі, а то і пастараюцца гідліва аббегчы.

Яшчэ сядзяць па вечарах ля пад'ездаў гарадскіх дамоў бабулькі, і ўжо амаль не сустрэнеш мужыкоў, што забіваюць на самаробных сталах «казла» ў даміно або ў карты. Людзі сталі аддаляцца адно ад аднаго. Хутчэй за ўсё, суседзі могуць пасварыцца з-за стаянкі аўто або паркоўкі, і, нават калі забрыдлыя чужакі будуць распіваць гарэлку перад пад'ездам, гучна лаючыся, спраўляючы жывёльную патрэбу, ніхто з жыхароў не прыструніць, не зробіць заўвагу. Больш за тое, мы агарадзіліся дамафонамі і нават суседу, які забыў ключы, не заўсёды дзверы пад'езда адчынім.

І мы сталі забывацца, што мы народ калектыўны, што поруч са спрадвечнай мараллю існавалі і ўзаемавыручка, і ўвага да традыцый, да роднай мовы.

Мне часам даводзіцца бачыць, калі, пачуўшы беларускую гаворку, людзі цяплеюць тварамі і нават уступаюць у гаворку, бо для многіх гэта вяртанне ў дзяцінства і юнацтва, у родныя мілыя мясціны.

Дык можа ранавата яшчэ станавіцца іншымі, адкладваць тое агульнае і наскае ў далёкую скрыню, забывацца, што такое талака?

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

# БЕЛЫ БІМ — НІЧЫЙНАЕ ВУХА

## У Баранавічах на вуліцы Лісіна разыгралася сапраўдная драма, якая выклікала шырокі рэзананс сярод гаспадароў «барсікаў» ды «тузікаў»



**Наталля Смірнова і такія ж, як яна, спагадлівыя жанчыны пастаянна кармілі бяздомных катоў. Не проста кармілі, а даглядалі, як свойскіх, сачылі за іх знешнім выглядам і здароўем, вакцынавалі. А калі жывёліна занядужала — адразу ў ветэрынарную лячэбніцу, не лічачыся ні з асабістым часам, ні з грашыма. Забраць дадому? Дык у кожнай ужо ёсць свае гадаванцы. А згодна з законам, у кватэры можна ўтрымліваюць толькі трох катоў ці сабак… Але, як правіла, дзе ёсць людзі, гатовыя ахвяраваць усім дзеля «братоў нашых меншых», знаходзяцца і тыя, хто іх ненавідзіць. Апошнія і звярнуліся ў жыллёва-эксплуатацыйную службу. Па выкліку прыехаў супрацоўнік спецаўтабазы. Сяргей Ермалаеў, які павінен быў адлавіць вулічных жывёл…**

— Мне патэлефанавала бабулька, з якой разам клапоцімся аб дваровых катах. Я выбегла на вуліцу ў той момант, калі Ермалаеў трымаў за шкірку ўсеагульнага любімца. Бедная істота білася ў канвульсіях і агоніі: з рота ішла пена,— Наталля Ціханаўна да гэтага часу не можа без хвалявання згадваць тыя падзеі.— Пачала клікаць на дапамогу людзей, прасіла не чапаць астатніх жывёлін. Але ён не слухаў. І тады я падскочыла да яго, каб загарадзіць ні ў чым не вінаватых істот. Пакуль ішла перапалка, каля дома сабраліся прахожыя, суседзі, абаронцы жывёл. Усе яны абвінавачвалі супрацоўніка спецаўтабазы ў неправамоцных дзеяннях...

Неўзабаве жыхары знайшлі за гаспадарчымі пабудовамі мёртвую кошку, дзе яна, пэўна, калі была яшчэ жывая, шукала паратунак…

### Выхаванне жорсткасцю

Згодна з пастановай Мінжылкамгаса № 23, пры адлове не павінна наносіцца шкода здароўю жывёл. У пастанове Савета Міністраў № 834 гаворыцца, што толькі ў выключных выпадках па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў улады допускаецца адстрэл бадзяжных жывёл, калі яны агрэсіўна сябе паводзяць ці западозраны ў шаленстве.

— Наша патрабаванне, каб змагары з вулічнымі «барсікамі» ды «тузікамі» прытрымліваліся закона, захоўвалі правілы адлову,— гаворыць Людміла Калашынская.

— Прыкра, што ў нас бяздомных жывёл забіваюць на вуліцы, на вачах у дарослых і дзяцей. Я б такія метады службаў па ачыстцы горада назваў выхаваннем жорсткасцю. Жывёл павінны ўсыпляць у пункце ветэрынарнага кантролю або ў пункце часовага знаходжання падназіраннем ветэрынарнага ўрача,— такое меркаванне прыватнага ветурача Глеба, які практыкуе не першы год.— За мяжой для эўтаназіі жывёл выкарыстоўваюць опійныя прэпараты, якія дзейнічаюць імгненна. У нас жа яны забаронены. Як правіла, камунальныя службы выкарыстоўваюць заакcілазін і Т-61. Яны афіцыйна зарэгістраваны і дазволены да прымянення. Аднак уся справа ў тэхналогіі: жывёліну спачатку трэба «выключыць», увесці з дапамогай наркозу ў глыбокі сон, калі кот ці сабака нічога не адчувае, а затым ужо калоць унутрывенна сродак, які спыніць дыхальную дзейнасць.

**Прыкра, што ў нас бяздомных жывёл забіваюць на вуліцы, на вачах у дарослых і дзяцей. Я б такія метады службаў па ачыстцы горада назваў выхаваннем жорсткасцю.**

Дадам, што ў Баранавічах няма пункта часовага знаходжання для бадзяжных жывёл, за адкрыццё якога не першы год змагаюцца абаронцы «братоў нашых меншых». Вядома, усе разумеюць, гэта не вырашэнне праблемы (лепшае выйсце — паўнавартасны прытулак для бяздомных чатырохногіх). Але ж… шанц, што яны адыдуць у іншы свет без болю і пакут. А магчыма, хтосьці з іх набудзе і гаспадара.

### Памаліцца можна і ў пустыні

У адной з баранавіцкіх газет выйшаў артыкул «Ці варта сабачыцца?». Там была выказана такая думка: «Са сцвярджэннем аб тым, што бадзяжныя жывёлы з'яўляюцца сур'ёзнай праблемай нашага грамадства, не спрачаюцца нават самыя ярыя іх абаронцы. Іншае пытанне, як яны бачаць рашэнне гэтай праблемы. Арганізацыя прытулку? Ідэя сама па сабе нядрэнная. Вось толькі ці настолькі мы багатыя, каб траціць мільёны на ўтрыманне жывёл, што аказаліся непатрэбныя сваім гаспадарам? Скажу шчыра, сама я вельмі люблю і катоў, і сабак. Аднак аддам перавагу, каб грошы з гарадскога бюджэту, напрыклад, ішлі на ахову здароўя, дапамогу абяздоленым састарэлым ці дзецям, якія засталіся без бацькоў. Другі шлях — арганізацыя прытулку на ахвяраванні гараджан. Але давайце быць шчырымі: асабіста вы пагадзіліся б кожны месяц аддаваць 50–60 тысяч на харчаванне і лячэнне бяздомных катоў-сабак? А перад тым, як адказаць, успомніце: колькі купюр вы ўжо апусцілі ў скрыні, якія стаяць у некалькіх гандлёвых кропках горада? І ці ўзялі вы хоць аднаго ката або сабаку з прытулку таварыства абароны жывёл «Міласэрнасць» да сябе ў дом».

— Замест таго, каб заклікаць разам, талакой пабудаваць прытулак для жывёл, газета разважае аб беднасці беларусаў. Усе ў нас жывуць добра. Амаль кожная сям'я мае аўтамабіль, адпачывае за мяжой. Катэджы растуць, як грыбы пасля дажджу. З другога боку, не трэба параўноўваць чалавека з жывёлай. Чалавек можа і павінен клапаціцца аб сабе, сваіх дзецях і састарэлых бацьках. І аб жывёле павінен, таму што жывёлы просяць аб дапамозе моўчкі,— пасыпаліся папрокі ў адрас аўтара.— Цяпер стала модна разважаць аб духоўнасці, збіраць грошы на будаўніцтва храмаў. Аднак веліч і духоўнасць нацыі вызначаюцца не толькі колькасцю пабудаваных храмаў, а нечым большым: стаўленнем да дзяцей, старых і жывёл. А памаліцца можна і ў пустыні…

Сапраўды, каталіцкі святар Францыск Асізскі, заступнік жывёл і навакольнага асяроддзя, гаварыў: «Не прычыняць пакут сабратам нашым меншым — першы абавязак. Але гэтага недастаткова, больш высокая місія служыць ім заўсёды».

### Ці будзе прытулак для беспрытульных?

Падчас пасяджэння «круглага стала» з удзелам усіх зацікаўленых начальнік гарадской ветэрынарнай станцыі Сяргей Нікалаеў прапанаваў увесці абавязковае чыпаванне хатніх жывёл: калі гадаванца выкінуць на вуліцу ці згубіцца сам, то яго можна знайсці і вярнуць уладальніку. Ён не супраць адкрыцця і пункта часовага знаходжання жывёл, але з абавязковай стэрылізацыяй і спробай знайсці для іх новых гаспадароў. Член грамадскага аб'яднання абароны жывёл «Міласэрнасць» Наталля Смірнова за тое, каб збор на ўтрыманне сабак паступаў на асобны рахунак. З цягам часу можна было б сабраць неабходныя грошы для будаўніцтва пункта часовага знаходжання. Галоўны інжынер Баранавіцкай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міхаіл Менча таксама падтрымаў прапанову аб чыпаванні і стэрылізацыі бадзяжных жывёл. Ён расказаў аб рэалізацыі праекта камунальнікаў і студэнтаў — будучых ветэрынараў горада Елгава. Сумеснымі высілкамі яны арганізавалі гасцініцу для хатніх і пункт часовага знаходжання для беспрытульных катоў і сабак. Камунальнікі вялі перамовы з Баранавіцкім універсітэтам (у Ляхавіцкім каледжы, які далучаны да гэтай навучальнай установы, рыхтуюць ветэрынараў). Аднак такі праект дорага каштуе. Таму і прапанаваў грамадскім арганізацыям па абароне жывёл дапамагчы з пошукам спонсараў.

— Мы захапляемся немцамі, якія на прыватныя ахвяраванні будуюць прытулкі, у іх багатая сацыяльная праграма па аказанні дапамогі і лячэнні бяздомных жывёл. У іх строгія меры супраць жорсткіх адносін з жывёламі. У Германіі ды іншых еўрапейскіх краінах не ўбачыш на вуліцах «нічыйнай» сабакі,— з болем у сэрцы, вельмі эмацыянальна гаворыць жыхарка Баранавічаў Людміла Калашынская.— Вельмі б хацелася, каб усе гараджане, грамадскія, хрысціянскія арганізацыі (праваслаўная царква, касцёл, іншыя канфесіі), падтрымалі ідэю стварэння прытулку для вулічных жывёл. Адна з запаведзяў Хрыста «Не забі!» адносіцца не толькі да людзей, але і жывёл.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

***Рыгор КАСАБУЦКІ, генеральны дырэктар Баранавіцкай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадаркі:***

— Мы прапанавалі ў наступным годзе пры фарміраванні гарадскога бюджэту закласці выдаткі на правядзенне праектных і вышукальных работ. На гэта даў «дабро» старшыня гарвыканкама Юрый Анатольевіч Грамакоўскі. Спадзяюся, што праз год у Баранавічах з'явіцца пункт часовага знаходжання для бадзяжных жывёл. Мы вывучалі вопыт работы такога пункта ў Брэсце, які працуе там ужо каля 20 гадоў. Магчыма, у Баранавічах мы пабудуем больш сучасны.

**— Якая сума неабходна для яго будаўніцтва?**

— Пакуль сказаць цяжка, трэба ўсё пралічваць. Гэта не таннае задавальненне. Але адкрыццё пункта часовага знаходжання — палова справы. Трэба падбіраць абслуговы персанал: ветурача, кухара і інш. Думаць, з якіх крыніц ім плаціць зарплату, як жывёлу забяспечыць ежай і лячэннем. Не ўсё так проста, як здаецца. Але пачатак пакладзены і трэба ісці далей.

**— А калі рэканструяваць пусты будынак для патрэб беспрытульных сабак і катоў?**

— Пабудаваць з нуля будзе танней. Па-другое, памяшканне для арганізацыі пункта часовага знаходжання цяжка знайсці, паколькі, згодна з санітарнымі патрабаваннямі, яно павінна быць за горадам.

■ Хто каго?

# «ТАТКА І ТОЙ АДВОДЗІЦЬ ВОЧЫ — НЕ ПА ІМ ПАЙШОЎ ЮРАСЬ…»

**Людзі дзеляцца (ці вам гэта казаць?) на старых і маладых, на сямейных і адзінокіх, на здаровых і хворых, на атэістаў і вернікаў, на прыхільнікаў і апазіцыю, на разумных і, мякка кажучы, не вельмі… Непітушчыя сустракаюцца, працавітыя, добрыя… А ўжо пітушчых ды злых…**

**А ўсё чаму? Таму, што апроч іншага, дзеляцца людзі на (загінайце пальцы) соў, што ўстаюць і кладуцца позна, жаўрукоў (устаюць і кладуцца рана) ды на… дзятлаў, з-за якіх совы ўстаюць рана, а жаўрукі кладуцца позна — з усімі адсюль наступствамі…**

Магчыма, якраз яны, гэтыя наступствы, і трапілі ў аб'ектыў фотакарэспандэнта «Звязды»,— атрымаўся здымак. А вось подпіс да яго — па традыцыі — узяліся прыдумаць чытачы, бо яно ж (як піша **спадар Анатоль Гарачоў з в. Даўнары Іўеўскага раёна):**

*З хлапчука таго не ўбудзе —*
*Можна і паскаліцца…*
*Ёсць яшчэ на свеце людзі:*
*Адпусці — паваляцца!*

Выходзіць, на здымку не найгоршы варыянт яшчэ: сядзіць хлапчук, а мог бы (паводле таго ж **спадара Гарачова)** і… ляжаць, бо

*Татка і той адводзіць вочы —*
*Не па ім пайшоў Юрась:*
*Ні ў салдаты, ні ў матросы,*
*Ні падносіць каламазь.*

Ды каб толькі гэта ганьба была, што не ўмее сынок нічога, а то ж (на думку **спадарыні Любові Чыгрынавай з Вілейшчыны):**

*Меў ён рызыку і форс —*
*За рулём сядзеў учора.*
*А цяпер — павесіў нос,*
*І няма спагады ў горы.*
*…Эх гарэліца, гарэлка!*
*Да чаго ж ты давяла?!*
*Не палюбяць цяпер дзеўкі,*
*Бо застаўся без руля.*

І без рубля, відавочна, хоць такой грашовай адзінкі ўжо і няма. Тысячы цяпер ды мільёны. Праўда, разлятаюцца яны… Быццам ветрам здзімае… Ведама — папяровыя. А з іншага боку…

Нехта не дурны прыдумаў, што трэба мужу рабіць, калі ў жонкі дрэнны настрой. Па-першае — змоўкнуць, па-другое — адступіць на бяспечную адлегласць, па-трэцяе — запусціць у яе поўным кашальком…

Лёгка сказаць — поўным, а вось напоўніць…

І сапраўды — цяжка. Дык можа, таму цяпер столькі ахвотных улезці ў нейкія крэдыты і даўгі, сумніўныя праекты, пагуляць у латарэі ці…

*Пагадала цыганка Ягорку:*
*«Табе свеціць шчаслівая зорка,*
*Не марудзь, а бяжы ў казіно —*
*Буйны выйгрыш чакае даўно!»*
*Ды… сарвалася зорка з арбіты:*
*Сеў Ягор —*
*быццам цюцька пабіты,—*



піша пра хлопца са здымка **спадарыня Любоў Чыгрынава.**

Што яшчэ магло падкасіць — маладога і, як быццам, не слабага?

А вось і не згадалі: на думку той жа **Любові Міхайлаўны** — дрэнныя навіны:

*Жонка мужу расказала*
*Пра цану на мяса, сала,*
*Паляндвіцу і каўбасы,*
*Да якіх ён дужа ласы.*
*Ахапіў мужчынку жах,*
*Не ўтрымаўся на нагах…*
*І пачуў быў голас звыш:*
*«Меней знаеш — лепей спіш».*

А калі перад тым, як легчы (ці сесці) яшчэ і на сон нешта ўзяць…

Ну чаму гэта чарку — на грудзі? Чаму таблетку? Можна, як лічыць **спадарыня Ірына Ермаковіч з в. Азяраўцы Браслаўскага раёна** і штосьці іншае, але не менш надзейнае:

*Вы ж ці бачылі, ці чулі?*
*Аўтакрамшчыкі паснулі!..*
*І тлумачыцца ўсё так:*
*Ім на продаж далі мак,*
*Мак у зернетках, харчовы,*
*А ён сон дае здаровы…*
*«Знямаў» нехта жменю зразу,*
*Дык не выехаў і з базы.*

Зрэшты не выехаць можна і не «знямаўшы», бо

*Як заўсёды ў шафераў*
*З пуцявымі — проста гора:*
*Час бы ехаць, штось вазіць,*
*А начальства — не злавіць!*
*Здаўна практыка такая:*
*Дзень працуем,*
*дзень — шукаем,—*

пішуць пра кіроўцаў **сужэнцы Астроўскія з г. Мінска.** З таго ж канверта і досыць лагічнае:

*У рэйс павінны ехаць двое,*
*Але Вася — з перапою.*
*Значыць, трэба пачакаць,*
*Памарудзіць ды паспаць.*
*Столькі часу, зразумела,*
*Пакуль «змей» не выйдзе з цела.*

А пакуль ён у ім…

І было б там хоць цела (кінулі вокам на верхні здымак?), а то:

*Практыканту з аўтапарка*
*свет не міл,*
*Бо ўчора з сябрукамі*
*многа піў.*
*Паляцела ўся зарплата,*
*галава трашчыць:*
*З чым цяпер ісці дахаты?*
*Як пражыць?..*
*Хто не жонку,*
*а бутэльку абдымае*
*Той ніколі шчасця-долі не пазнае!*

Выснова вось гэта (ад **спадарыні Ніны Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна)** як быццам не новая і ўвесь час на слыху. А «не чулі» яе вельмі многія: Беларусь — як ні сумна прызнацца — усе рэкорды пабіла па спажыванні алкаголю: 17,5 літра ў год на душу насельніцтва!

І, відаць, пра яе, тую самую «душачку», піша **спадар Віктар Трайкоўскі з Мінска:**

*Ехаў Ясь зусім не шпарка,*
*Ды стаміўся у знямозе:*
*Стала лішняй адна чарка —*
*Рух спыніла на дарозе!*

Не іначай Ясь той на бульдозеры ці камбайне ехаў? І сярод вуліцы стаў… А чаму б і не, калі «дуракам закон не писан, если писан, то не читан, если читан, то не понят, если понят, то не так». Альбо іншымі словамі (ад **спадара Гарачова):**

*Сядзіць хлапчына ледзь жывы,*
*Жыццё яго — зусім не казка:*
*Ён рады быў — займеў правы,*
*А з імі ж — процьма абавязкаў!*

Пра адзін з іх піша **спадар Валерый Гаўрыш з г. п. Чавусы:** «Я лічу, што на гэтым здымку — канфлікт пакаленняў: сын — няйначай — папрасіў блаславення на шлюб, а бацька — яго не даў». І правільна зрабіў, як лічыць Валерый Мікалаевіч:

*Хлопча, до журыцца!*
*Бацька мае рацыю:*
*Не пара жаніцца —*
*Скончы адукацыю.*

Паводле ж **спадарыні Марыі Грышчанкі з Дзяржынска,** на здымку ўсё наадварот: гэта дзіця, калі можна так сказаць, вучыць бацечку, нагадвае пра яго абавязкі:

*Маладуху, бач, знайшоў*
*Ды сабраўся з'ехаць?..*
*Сын да розуму давёў:*
*Сеў, не даў праехаць.*
*Мовіў: «З глузду не з'язджай,*
*Нас з матуляй не кідай!»*

Праўда, калі яна, тая матуля (паводле **спадара Гаўрыша)** сама іх не кінула — у пашыраным сэнсе слова:

*Усе надзеі былі ў Клаўкі,*
*Што «наварыць» з аўталаўкі.*
*Два гады людзей дурыла…*
*Ды інспекцыя злавіла.*
*Краты свецяць — не іначай…*
*Муж у трансе, сын аж плача.*

Гора… Вось гэта — дакладна. А іншае — пад пытаннем яшчэ (ад **спадара М. Куцько з Маладзечна):**

*Гэта гора ці не гора,*
*Як захраснеш у заторы?..*
*Ёсць у нас яшчэ дарогі,*
*Дзе сам чорт паломіць ногі!*

І — дадамо (ад **спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля)** — дзе якраз яго, таго самага чорта, узгадвае кожны кіроўца, прычым — далёка не раз:

*У нязручных позах спяць —*
*Сон змарыў «вадзілаў»,*
*Бо на мытні ўжо стаяць*
*Пятую гадзіну!*

І гэта, вядома ж, не рэкорд. «Яшчэ ў часы перабудовы недзе чытаў, што ў Японіі ўсе пагрузачна-разгрузачныя работы праводзяцца строга па раскладзе (прыехаў, загрузіўся або загрузіўся, ад'ехаў і ніякіх прастояў). А што ж у нас? — пытае **спадар Мікалай Старых.**— Я жыву ў Гомелі непадалёк ад гандлёвага цэнтра і вельмі часта бачу, як каля яго (і праз чвэрць стагоддзя!) збіраецца чарга аўтамабіляў — метраў 100 даўжынёй! Дык ці не таму японцы больш зарабляюць і лепей жывуць? А мы…»

Пра нас Мікалай Валянцінавіч піша ў рыфму:

*Спіць шафёр і «ў вус не дзьме»,*
*У цянёчку — сон харошы.*
*Бо працоўны час ідзе.*
*Працадаўца плаціць грошы…*
*І абодва ўпотай мараць,*
*Як па леце ці вясне*
*Ім па тысячы даляраў*
*Хтось штомесяц паднясе.*

На яе, тую тысячу ў месяц, можна б жыць — пры сённяшніх цэнах. А пры заўтрашніх? Растуць яны, як грыбы…

Зрэшты, і пра гэтую балючую прозу можна не празаічным радком, а паэтычным, дасланым **спадарыняй Соф'яй Кусянковай з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна.** Чытайце:

*Наш дырэктар аўтабазы*
*Распякаў усіх адразу:*
*Хоць лажыся і памірай,*
*Але план на месяц — дай!*
*Ну а хлопцы — разважаць,*
*Ды ўзгадваць яго маць:*
*Цэны выраслі ўдвая…*
*А вось заробкі…*

На вялікі жаль, не, не на столькі.

Самы час тут цяжка ўздыхнуць ды ўспомніць, што такое дастойная зарплата. Гэта — калі бухгалтэрыя настойліва запрашае атрымаць яе, новую, а вам лянота ісці. Ды і навошта, калі не патрачаны пяць папярэдніх?..

Але ж ёсць, па сведчаннях, перавага і ў працы цяжкай, з дрэннымі заробкамі. Такую знайсці хутчэй — любому…

Хоць яно, можа, і маюць рацыю **сужэнцы Астроўскія:**

*Не дай Бог уладкавацца*
*Ды гадамі кантавацца:*
*Ехаць ноччу, ехаць днём,*
*Спаць і есці за рулём,*
*У нядобрае імгненне*
*Трапіць недзе ў здарэнне…*
*Ды жыццё сваё дыктуе:*
*Мы жывём, пакуль працуем!*

І тут, відаць, да месца словы некага з класікаў, што ўзрост ды адзінота — гэта, вядома ж, выпрабаванні, але не самыя страшныя. Бо найстрашнейшае — сядзець без справы…

Нехта з чытачоў, можа, гэта рабіў — толькі што: бавіў час за праглядам газеты? А тут, бач, новы конкурсны здымак… І да яго можна прыдумаць подпіс. Альбо некалькі — пажадана — трапных, дасціпных, не больш за восем радкоў. Добрая справа! Поспехаў!

Што ж датычыцца папярэдняга здымка (гл. нумар «Звязды» за 24 мая), то, паводле вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра, скажам так, мыццё спіны на вадаёме, напісалі спадарыні Чыгрынава з Вілейшчыны, Грышчанка з Дзяржынска, Васільева з Гомеля, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Гаўрыш з Чавусаў, Нефідовіч з Лунінеччыны, Гарачоў з Іўеўшчыны і Міранoвіч з Бабруйска. Яго радкі:

*Нехта скажа, што ў рацэ*
*Хлопец абмываецца?*
*Не, тут ролік для БТ*
*Трэці дзень здымаецца:*
*Той рэкламы ўжо замала,*
*Бо цяпер і мыла «Мара»!)*

упадабала і журы маленькае, рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал гэтага года накіроўваецца ў Бабруйск.

Вы таксама хацелі б атрымліваць «родную газету на роднай мове»? Тады выпісвайце. Альбо — глядзіце на здымак, змешчаны ўнізе, стварайце варыянты подпісаў. Цалкам магчыма, што ўдача ўсміхнецца вам.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P. S.** Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, пошта прынесла яшчэ адзін ліст (з Бабруйска, ад спадарыні М. Шурпо), яшчэ адзін подпіс да верхняга здымка. І, як падаецца, варты ўвагі:

*Калі спёка даканае,*
*Калі спраў на дзень — мільён,*
*Нам не «Ролтан» дапаможа,—*
*Дапаможа моцны сон*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Бяспека на дарогах

# КАМЕРА НЕ СПІЦЬ...

**У Беларусі да канца лета плануецца павялічыць колькасць фотакамер для фіксацыі хуткасных рэжымаў на дарогах да 200, паведаміла БЕЛТА старшы інспектар па асаблівых даручэннях ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Ганна БАНАДЫК.**

Сродкі аўтаматычнай фотафіксацыі хуткасных рэжымаў дзейнічаюць на аўтамабільных дарогах краіны з 5 ліпеня 2012 года. На сёння 118 стацыянарных камер і 10 мабільных (пераносных) датчыкаў пакрываюць асноўныя транспартныя артэрыі рэспублікі. «Да канца лета колькасць фотакамер плануецца давесці да 200», — адзначыла Ганна Банадык.

Паводле яе слоў, асноўная мэта выкарыстоўвання камер — прафілактыка парушэнняў хуткасных рэжымаў у месцах павышанай рызыкі здзяйснення ДТЗ. Таму месца іх устаноўкі ніколі не замоўчваюцца, а, наадварот, анансуюцца ў СМІ. Існуе і пастаянна абнаўляецца інтэрнэт-сэрвіс, дзе на карце Беларусі пазначаны месцы размяшчэння стацыянарных датчыкаў кантролю хуткасці.

Аб правядзенні кантролю з дапамогай камер аўтамабілістаў папярэджваюць жоўтыя таблічкі «Radar. Фотакантроль». Па аналогіі з правіламі размяшчэння папераджальных дарожных знакаў іх усталёўваюць да месца размяшчэння камеры на адлегласці ад 150 да 300 м па-за населенымі пунктамі і ад 50 да 100 м у населеных пунктах.

Усё гэта робіцца для таго, каб своечасова інфармаваць кіроўцаў, забяспечыць захаванне таго хуткаснага рэжыму, які ўведзены на канкрэтным участку дарогі, і такім чынам забяспечыць бяспеку. Тым не менш, штомесяц камеры аўтаматычнай фіксацыі хуткасных рэжымаў рэгіструюць каля 55 тыс. парушэнняў, за якія вадзіцелі прыцягваюцца да адказнасці.

Калі кіроўца перавысіў хуткасць на 10-20 км/г, яму выпісваецца штраф — 0,5 базавай велічыні (сёння адна базавая велічыня складае Br150 тыс.); пры перавышэнні хуткасці на 20-30 км/г штраф складае адну базавую велічыню; калі кіроўца разганяецца мінімум на 30 км/г вышэй, чым дазволена, штраф — тры базавыя велічыні. У выпадку паўторнага парушэння на працягу года больш за 20 км/г — штраф у памеры Br750 тыс. Пры гэтым уся інфармацыя аб «паслужным спісе» кожнага кіроўцы захоўваецца ў адзінай базе ДАІ.

З-за парушэнняў хуткаснага рэжыму штогод адбываецца больш за 20% усіх ДТЗ, якія здзяйсняюцца па віне кіроўцаў. За шэсць месяцаў гэтага года перавышэнне хуткасці стала непасрэднай прычынай 218 ДТЗ, у якіх загінулі і пацярпелі людзі. Большая частка дарожных здарэнняў, так ці інакш, звязана з хуткасцю.


zepter bank

**Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»**

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б

эл. адрес: info@zepterbank.by.

Тел.: 331 89 49, факс 331 89 48


**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 20 562,3 | 14 524,5 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 43 450,7 | 53 312,6 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 58 423,2 | 29 747,2 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 166 817,3 | 155 499,8 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 266 022,7 | 279 763,9 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 43 290,1 | 29 247,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 669,3 | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 9 535,2 | 3 161,8 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 608 770,8 | 565 257,0 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 7 911,2 | 7 796,6 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 40 864,8 | 36 779,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 233 533,5 | 189 783,3 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 26 249,2 | 67 618,0 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 6 624,9 | 4 218,9 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 315 183,6 | 306 196,4 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 149 487,0 | 149 487,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 8 571,3 | 7 474,4 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 26 460,5 | 20 898,3 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 109 068,4 | 81 200,9 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 293 587,2 | 259 060,6 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 608 770,8 | 565 257,0 |

Председатель Правления Миронов Илья Борисович

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания 02.07.2014 г.

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 37 127,9 | 35 198,6 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 17 265,6 | 19 434,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 19 862,3 | 15 764,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 4 630,9 | 4 465,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 697,7 | 572,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 3 933,2 | 3 892,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 783,3 | (1 156,4) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 18 725,1 | 4 944,9 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (83,5) | 48,3 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 11 622,1 | 3 202,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6 549,2 | 268,9 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24 859,0 | 15 494,1 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 831,8 | 749,8 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 12 456,7 | 4 316,7 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 1 326,7 | 211,6 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 11 130,0 | 4 105,1 |

Председатель Правления Миронов Илья Борисович

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания 02.07.2014 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 31 от 28.05.2013 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214.

**В опубликованную проектную декларацию по объекту: «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и №9 по г/п в квартале пр. Победителей – ул. Проектируемая № 3 – ул. 4-ое Кольцо – ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий» в газете «Звязда» от 23.02.2013 г.**

## ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ:

**Жилой дом № 9 (по генплану)** состоит из встроенных помещений общественного назначения и непосредственно жилой части. Дополнительно проектом предусмотрено строительство открытых автомобильных парковок, размещаемых вдоль проезжей части, общей вместительностью 75 м/мест. Количество этажей шесть. Здание жилого дома ориентировано главным фасадом на проспект Победителей и является структурно повторяющимся элементом застройки, формирующим облик микрорайона в целом. Генеральный план застройки решен компактно с учетом рельефа местности, выгодного градостроительного положения, функционального зонирования территории, существующих и проектируемых транспортных и инженерных коммуникаций, а также обеспечения противопожарных норм и правил. Конструктивная схема здания– монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона.

**Наружная отделка фасадов:**

Для наружных светопрозрачных стен применены: витражная алюминиевая система; в качестве заполнения использованы: в светопрозрачной части – двукамерный стеклопакет, в непрозрачной части – непрозрачное стекло и алюминиевые панели. Оконные блоки – стеклопакеты ПВХ и алюминиевые витражи, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку (стены – улучшенная штукатурка, потолки – монолитная железобетонная плита). Предусмотрен мусоропровод. Здание оборудовано необходимыми инженерными системами, необходимыми для функционирования жилого дома. Предусмотрено выполнение мероприятий по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и маломобильных групп населения.

**В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в общую долевую собственность**, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, мусоросборники, тепловые пункты, водомерный узел); коридоры (за исключением коридоров, составляющих вспомогательные площади по отношению к встроенным, встроенно-пристроенным помещениям), вестибюли, межэтажные лестницы и тамбуры, конструкции дома, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, гостевые парковки.

Вся территория благоустраивается и озеленятся за счет организации подъездов, проездов и автостоянок, формирования сети пешеходных тротуаров, дорожек и аллей, площадок, устройства подпорных стенок и наружных лестниц, создания декоративно-ландшафтных композиций, расстановки малых архитектурных форм.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц**

**однокомнатные – общей площадью 46,7 м² – 4 квартиры;**

**однокомнатные – общей площадью 53,7 м² – 4 квартиры;**

**двухкомнатные – общей площадью от 67,67 м² – 4 квартиры;**

**трехкомнатные квартиры – общей площадью 103,21 м² – 4 квартиры.**

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных представителей за № 191450284.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2, пом. 7 (№ 1508).**

Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства директор Валерий Иванович Самущик, действует на основании Устава.

**Тел.: 8 (017) 226 43 99; 8 029 314 11 14.**

**ПРАДАЕЦЦА**

ўчастак у садовым таварыстве «Бярозаўка», Брэсцкі напрамак, 35 км ад МКАД, 10 сотак, фундамент. Тэлефон: 8-029-251-88-86.

**ВНИМАНИЮ КРЕДИТОРОВ ОАО «БизнесРент»**

ОАО «БизнесРент» сообщает об уменьшении своего уставного фонда. Новый размер уставного фонда ОАО «БизнесРент» 71 712 000 белорусских рублей.

За дополнительной информацией и для предъявления требований о досрочном погашении обязательств обращаться по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 1., пом. 1, офис 22 и по телефону: 8(017) 335-04-79.

УНП 191483291

Утерянную квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) ЗСАО «БелИнгострах» формы 1-СУ серии КС № 4248280 **считать недействительной.** УНП 100219645

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ на право заключения договора аренды земельного участка

| Наименование объекта | Лот № 1 |
|---|---|
| Целевое назначение | Строительство и обслуживание базы отдыха |
| Местонахождение объекта | северо-восточнее агрогородка Луково Малоритского района |
| Продавец объекта | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Организатор торгов | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Начальная цена продажи, руб. | 299 029 |
| Сумма задатка, руб. | 59 805 |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер | 0,3962 га, Решение Брестского областного исполнительного комитета от 18.09.2012 г. № 724, Кад. № 125281300001000015 |
| Ограничения в использовании земельного участка | Водоохранная зона озера Луковское на площади 0,2250 га, в прибрежной полосе озера Луковское на площади 0,1712 га |
| Вещное право, срок аренды земельного участка | Аренда 50 лет |
| Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб. | 2 845 800 |
| Условия продажи | 1. Внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>2. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением аукциона;<br>3. Заключение с Малоритским райисполкомом в установленном порядке договора аренды земельного участка и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка;<br>4. Получение в установленном порядке разрешения Малоритского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка проектной документации на строительство базы отдыха;<br>5. Приступить к использованию земельного участка не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта;<br>6. Осуществление строительства объекта в срок, определенный проектной документацией; |

Аукцион состоится **29 июля 2014 года в 11.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.

**Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 30 01, 2 30 17, 2 28 03.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

*2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет № 3600223000240, банк – г. Брест, филиал 100 УО АСБ «Беларусбанк», код банка 150501246, код платежа 04002, получатель платежа – районный бюджет, УНН 200676206.*

3. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

**– Для аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства жилого дома.*

**Заявления об участии в аукционе принимаются до 23 июля 2014 года (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 54, землеустроительная служба Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

## ОРГАНИЗАТОР: НОВОЗАРЯНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | п. Набережный, ул. Набережная, 3У площадью – 0,2120 га, кадастровый номер 225183308101000014 | Для строительства и обслуживания жилого дома | - Водоохранная зона и прибрежная полоса водного объекта (озеро Лукомльское);<br>- охранная зона линии электропередачи напряжением до 1 000 В | 6 391 498 | 2 681 588 | 268 159 |
| 2 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 8Б площадью – 0,2476 га, кадастровый номер 225183310101000037 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 5 750 600 | 3 445 101 | 344 510 |
| 3 | д. Симновичи, ул.Озёрная, д. 3У площадью – 0,2486 га, кадастровый номер 225183310101000038 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 7 722 448 | 3 202 713 | 320 271 |
| 4 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 4У площадью – 0,2391 га, кадастровый номер 225183310101000039 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 7 167 342 | 3 080 325 | 308 032 |
| 5 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 5У площадью – 0,2466 га, кадастровый номер 225183310101000040 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 7 167 342 | 3 176 948 | 317 695 |
| 6 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 6У площадью – 0,2497 га, кадастровый номер 225183310101000041 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 6 958 165 | 3 216 885 | 321 689 |

1. Аукцион состоится **15 августа 2014 года в 15⁰⁰** по адресу: аг. Новая Заря, сельисполком.

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8⁰⁰ до 13⁰⁰ и с 14⁰⁰ до 17⁰⁰ по адресу: аг. Новая Заря, сельисполком. Последний день приема заявлений **12 августа 2014 года до 17⁰⁰.**

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату залога на расчетный счет 3641329060024 ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление РКЦ № 10, МФО 150801424, УНП 300986744, код платежа 04002, получатель – Новозарянский сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельными участками в натуре.

**Контактные телефоны: (8 02133) 2 64 45, 2 64 35.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ

### транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | Право заключения договора аренды отдельных помещений общей площадью 87,4 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, телефонизация) на 1-м этаже здания вокзала (инв. № 100/С-47089) по ул. Кижеватова, 1Б/1 в г. Бресте |
| Балансодержатель | Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| Начальная цена продажи (руб.) | 1 714 110 |
| Сумма задатка (руб.) | 171 400 |
| Срок аренды | 5 лет |
| Ставка арендной платы | 6 856 603 рубля (67,22 базовой арендной величины на момент заключения договора аренды) |
| Условия оплаты | разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 15 000 000 |
| Условия продажи | для размещения парикмахерской |
| Организатор аукционных торгов | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:

копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем:

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом, – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.**

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 31 июля 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.07.2014 г. до 17.30 25.07.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

## Организатор аукциона: Октябрьский сельский исполнительный комитет

### 222033, д. Прошика, ул. Центральная, д. 9, Крупского района Минской области

| № лота | Кадастровый номер, адрес земельного участка, номер участка | Целевое назначение | Площадь (га) | Срок аренды (лет) | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Дата и время проведения аукциона | Окончательный срок приема документов |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 623084003101000064, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Дубы, ул. Подгорная (участок № 1) | Для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1271 | 99 | отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений | 1423800 | 213570 бел. руб. р/с 3604618091007 в ЦБУ № 610 г. Крупки ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, код 810, УНП 600176883, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 11.08.2014 г. в 15.00 | 05.08.2014 г. до 17.00 |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 623084004601000122, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, аг. Колодница, ул. Центральная (участок № 2) | Для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1795 | 99 | имеются центральное водоснабжение, асфальтированный подъезд | 2613690 | 392050 бел. руб. р/с 3604618091007 в ЦБУ № 610 г. Крупки ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, код 810, УНП 600176883, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 11.08.2014 г. в 15.00 | 05.08.2014 г. до 17.00 |
| 3 | Земельный участок с кадастровым номером 623084004601000123, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, аг. Колодница, ул. Центральная (участок № 3) | Для строительства и обслуживания жилого дома | 0,2273 | 99 | имеются центральное водоснабжение, асфальтированный подъезд | 3305250 | 495790 бел. руб. р/с 3604618091007 в ЦБУ № 610 г. Крупки ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Борисов, код 810, УНП 600176883, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 11.08.2014 г. в 15.00 | 05.08.2014 г. до 17.00 |

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона на право заключения договора аренды:

- внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка;

- возмещения расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения;

- заключения с Октябрьским сельским исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после его заключения государственной регистрации права на земельный участок;

- получения в установленном порядке разрешения отдела по архитектуре и строительству Крупского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и строительство нового объекта;

- получения в установленном порядке заключения заинтересованных служб на проектирование и строительство объекта;

- снятия на занимаемом земельном участке плодородного слоя и использования его для нужд, связанных со строительством объекта;

- осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

- производство благоустройства прилегающей территории и строительства внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно разработанной и утвержденной проектной документации.

1. **Аукцион состоится по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, ул. Заречная, д. 5-а (здание Прошикского сельского клуба).**

2. **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, ул. Центральная, д. 9 (здание Октябрьского сельского исполнительного комитета, кабинет № 3).**

3. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должно подать заявление об участии в аукционе и заключить соглашение с организатором аукциона о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. К заявлению прилагается:

- гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

- индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. **Заключительная регистрация участников аукциона, подавших заявление на участие в аукционе, 11.08.2014 г. до 14.50 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, ул. Заречная, д. 5-а (здание Прошикского сельского клуба).**

5. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участка трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона — победителем.

6. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.

7. Возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, и расходов по подготовке документации, необходимой для его проведения, производится победителем аукциона.

8. **Контактные телефоны: (801796) 4 91 10, 4 91 38.**

# ЛАСКА ГОРЫ РАЗБІВАЕ



**Па гарызанталі: 1.** Блізкі ... лепш дальняй радні (прык.). **4.** ... не знявага (прык.). **6.** ... і ў балоце свеціцца (прык.). **10**. З шчасцем і ў ... добра хадзіць (прык.). **11**. ... без сябра, што ежа без солі (прык.). **12**. Язык гадзіцца на прыказкі, а ... — на прывязкі (прык.). **15**. ... горы разбівае (прык.). **17**. ... і сілу перамагае (прык.). **19**. Добрая ... цяплей за валёнкі (прык.). **20**. Той ..., хто прыняў бой (прык.). **21**. Добрая ... ў кошыку ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць (прык.). **22**. Жывуць як аднае маткі ... (прык.). **24**. Лепей драўляная ..., чым залатая сварка. **26**. Аптычная прылада для вачэй. **30**. Сябар даражэй за ... (прык.). **32**. І ... добры дух чуе (прык.). **33**. ... мацней за каменныя сцены (прык.). **34**. ... кашы пры хлебе, ... бабе пры дзеду (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Каса любіць брусок і ... кусок (прык.). **2.** Языком ... не накосіш (прык.). **3.** Ласкавае цялятка ... маткі ссе (прык.). **5.** Які ... — такі і тын, які бацька — такі і сын (прык.). **7.** Добры гаспадар з вясны б'е ... (прык.). **8.** Пра смелага, гордага чалавека (перан.). **9.** Царква. **13**. Для добрага чалавека — пшанічны ..., а для злыдня — костка ў горла (прык.). **14**. Там, дзе згода, заўсёды добрая ... (прык.). **16**. Мір ясны ад ..., а чалавек — ад навукі (прык.). **18**. Плод, семя злакаў. **21**. Штучная крупа з бульбянога крухмалу. **23**. У каталіцкай царкве літургія. **25**. Там добрая дзея, дзе ... арэ, а трэці сее (прык.). **27**. Навошта той ... , калі ў дзетках лад (прык.). **28**. Край дыска Сонца, Месяца. **29**. ... людзей гартуе (прык.). **31**. Вузкі край якога-небудзь прадмета.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**
**Па гарызанталі:** 1. Сусед. 4. Адвага. 6. Золата. 10. Грыбы. 11. Чалавек. 12. Скура. 15. Ласка. 17. Розум. 19. Жонка. 20. Герой. 21. Слава. 22. Дзеці. 24. Згода. 26. Акуляры. 30. Грошы. 32. Сабака. 33. Дружба. 34. Добра. **Па вертыкалі:** 1. Сала. 2. Сена. 3. Дзве. 5. Дуб. 7. Ток. 8. Арол. 9. Храм. 13. Каравай. 14. Прыгода. 16. Сонца. 18. Зерне. 21. Сага. 23. Імша. 25. Два. 27. Клад. 28. Лімб. 29. Рада. 31. Руб.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Неабходна ўзнесціся над мітуснёй, каб максімальна выкарыстаць прадастаўленыя вам магчымасці. У аўторак многае будзе раздражняць, а ваша ініцыятыва можа аказацца не вельмі ўдалай. Незадаволенасць партнёрамі па працы павінна прайсці на наступны дзень, і вы забудзецеся пра рознагалоссі. Бліжэй да выхадных паспрабуйце ўнесці ў жыццё больш разнастайнасці.

**ЦЯЛЕЦ.** Займацца тым, што вы запланавалі на гэты тыдзень, можа аказацца складана, таму лепш адразу падрыхтавацца да некаторых магчымых змен у планах. Не выключана, што ў першай палове тыдня давядзецца выдаткаваць шмат часу на вырашэнне чужых праблем. У пятніцу можаце атрымаць прыемную вестку, пры правільным тлумачэнні якой вы палепшыце сваё фінансавае становішча.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень будзе напоўнены падзеямі і ўражаннямі. Сваю канфліктнасць паспрабуйце выкарыстоўваць толькі ў своечасовых і неабходных у пэўны момант дзеяннях. Вы справіцеся амаль з усімі важнымі справамі, нават з тымі, да якіх раней ніяк не даходзілі рукі.

**РАК.** Тыдзень прынясе задавальненне ад дзелавых сустрэч і кантактаў, а для грамадскай дзейнасці можа спатрэбіцца значна больш часу, чым звычайна. Сур'ёзнасць і аптымізм дазволяць дасягнуць вызначаных мэт і перайсці да новых задач.

**ЛЕЎ.** Неабходна прадумаць план сваіх дзеянняў і не марнаваць лішнія сілы на мітусню і пустыя зносіны. Паспрабуйце пазбягаць перагрузак на працы — стан вашага здароўя нашмат важней. Калі да вас звернуцца па дапамогу, не адмаўляйцеся, але і не ўзвальвайце на сябе цяжар чужых праблем.

**ДЗЕВА.** Жаданні і рэальныя дзеянні могуць прыйсці цяпер у пэўны дысананс. Магчыма, вы вырашыце, што навакольныя вас проста выкарыстоўваюць і нічога не даюць узамен. Паверце, гэта зусім не так. Давядзецца ўціхамірыць сваё самалюбства і падпарадкавацца распараджэнням вышэйстаячых. Паспрабуйце своечасова спыніцца, каб не справакаваць сваркі з блізкімі людзьмі.

**ШАЛІ.** Адным з самых удалых дзён можа стаць панядзелак, калі ўсё ў вас будзе атрымлівацца, калі змогуць рэалізавацца вашы прафесійныя задумы, а атмасфера на працы будзе добразычлівай і камфортнай. Цяпер можна падумаць пра дадатковы заробак — гэтая думка акажацца ўдалай і своечасовай.

**СКАРПІЁН.** Фонам гэтага тыдня могуць стаць выдатны настрой і ўпэўненасць у сваіх сілах. Не варта кідацца ў крайнасці, хапаючыся за шмат спраў адначасова. Паспрабуйце выбраць галоўную і давесці яе да канца. Адстойваючы сваё меркаванне, праявіце кемлівасць, тады вы зможаце атрымаць усё неабходнае для прасоўвання вашай справы.

**СТРАЛЕЦ.** Для прадухілення сітуацый, якія перашкаджаюць раскрыццю творчага патэнцыялу, неабходна цярпенне і стрыманасць у праяўленні эмоцый. У ветлівых дыскусіях і лютых спрэчках вам неабходна не толькі прытрымлівацца свайго пункту гледжання, але і чуць аргументы апанентаў. Не будзьце празмерна ўпартымі. Цяпер самы час змяніць светаадчуванне і выкінуць састарэлыя погляды з жыцця.

**КАЗЯРОГ.** Вас чакае поспех у прафесійнай сферы і бізнесе. Калі аб'ём работы на тыдзень і не здзівіць вас, то вынікі працы могуць засмуціць. Увагу начальства можа прыцягнуць ваша здольнасць утрымліваць у памяці драбнюткія падрабязнасці. Чацвер удалы для рызыкі і прыняцця хуткіх рашэнняў. У нядзелю ў шчырай размове не раскрывайце душу: могуць няправільна зразумець ці паспрабуюць скарыстаць сказанае супраць вас, злёгку сказіўшы вашу версію.

**ВАДАЛЕЙ.** Паспрабуйце адразу і ў поўную сілу прыступіць да сваіх абавязкаў. Будзьце ўважлівыя з дакументамі: не выключаны пэўныя няўвязкі. Магчымыя інтрыгі, так што будзьце больш абачлівымі з калегамі. Паспрабуйце не ўступаць у бурныя спрэчкі з навакольнымі: вы толькі папсуяце свае нервы. Лепш успомніце аб назапашаных хатніх справах і паспрабуйце разабрацца з імі.

**РЫБЫ.** Вельмі спатрэбіцца спакой і развражлівасць. Многія вашы жаданні здзейсняцца, калі будзеце менш гаварыць і лепш захоўваць свае тайны. Інтуіцыя павінна падказаць, як правільна здзейсніць чарговы рывок па кар'ернай лесвіцы. Пятніца багатая на спрэчкі і канфлікты — паспрабуйце не правакаваць на гэта навакольных.

■ У свеце жывёл

# Мінчане скардзяцца на... варон



**У сталіцы зафіксаваны адзінкавыя выпадкі нападзення птушак на гараджан, паведамілі ў Мінскім гарадскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Паводле слоў спецыялістаў, звароты падобнага характару паступаюць звычайна ў адрас сталічных эколагаў і структурныя падраздзяленні МНС. Апошнім часам, у прыватнасці, у камітэт прыродных рэсурсаў было накіравана некалькі такіх скаргаў. Віноўніцы — агрэсіўна настроеныя вароны.

— Канфлікт паміж мінчанамі і варонамі досыць зразумелы, — каментуе сітуацыю начальнік аддзела дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, лясоў, жывёльнага і расліннага свету Мінгаркампрыроды Мікалай Козак. — Птушкі цяпер гадуюць птушанят. Апераныя малыя нярэдка вывальваюцца з гнязда.

Арнітолагі лічаць, што варон-падлеткаў і іншых птушанят, якія выпалі з гнязда, лепш не чапаць. Пра іх паклапоцяцца птушыныя бацькі. У іншым выпадку можна чакаць нападзення. Вароны, напрыклад, звычайна бясстрашна абараняюць сваіх птушанят. Яны пачынаюць крычаць, прыцягваючы ўвагу суродзічаў, збіраюцца ў вялікай колькасці і атакуюць чужынца.

**Наталля ВАВІЛАВА,**
**«Мінск — Навіны».**

## У СТАЛІЧНЫМ ЗААПАРКУ ПАСЯЛІЛІСЯ АРА І ТУКАНЫ

У Мінскім заапарку навасельцы — два туканы і чатыры сінежоўтыя папугаі ара. Як расказала малодшы навуковы супрацоўнік асветніцкага аддзела ўстановы Таццяна Ільясава-Кананава, птушак прывезлі ў канцы чэрвеня. Дагэтуль яны знаходзіліся на каранціне. Цяпер на птушак ужо можна паглядзець: іх пасялілі ў летніх вальерах. Абодва віды занесены ў міжнародную Чырвоную кнігу.

**Надзея ІЛЬЯШУК,**
**«Мінск — Навіны»**

Даты | Падзеі | Людзі

**1918** год — у Маскве падчас работы V Усерасійскага з'езда Саветаў левыя эсэры ўзнялі антыбальшавіцкі мяцеж, які завяршыўся іх паражэннем. У выніку члены леваэсэраўскай партыі былі выключаны з органаў савецкай улады. У краіне ўсталявалася паўнаўладдзе кіруючых вярхоў бальшавіцкай партыі.

**1914** год — 100 гадоў таму нарадзіўся (вёска Крывель Магілёўскага павета, цяпер Шклоўскі раён) Пётр Мартынавіч Алейнікаў, вядомы савецкі кінаакцёр. У 1935 годзе скончыў Інстытут сцэнічных мастацтваў у Ленінградзе. З 1932 года здымаўся ў кіно. З уласцівымі яму абаяннем, прастатой і натуральнасцю выканання ўвасобіў на экране тып маладога сучасніка — вясёлага, жыццярадаснага хлопца. Здымаўся ў фільмах «Сямёра смелых», «Трактарысты», «Вялікае жыццё», «Неба Масквы» і іншых. Апошні фільм, у якім зняўся Пётр Алейнікаў ужо будучы цяжка хворым, — «Спатоленне смагі». За выкананне ў ім складанай драматычнай ролі ў 1967 г. пасмяротна ўзнагароджаны спецыяльнай прэміяй 3-га Усесаюзнага кінафестывалю. Памёр у 1965 годзе. Агульнавядомая гісторыя, што, калі Пятра Алейнікава не стала, яго блізкі сябар акцёр Барыс Андрэеў (народны артыст СССР, лаўрэат дзвюх Сталінскіх прэмій) прыйшоў у Массавет і, стукнуўшы кулаком па стале, заявіў: калі Пятру, які не мае звання народнага артыста СССР, не знойдзецца месца на Новадзявочых могілках, то ён, Андрэеў, саступае сваё. І Алейнікава пахавалі на прэстыжным цвінтары. Мала хто ведае, што сам Барыс Фёдаравіч, які перажыў Пятра Мартынавіча на 17 гадоў, ляжыць далёка ад магілы закадычнага сябра — на Ваганькаве. Проста яму свайго месца на Новадзявочых ніхто не аддаў…



**1943** год — адбылася танкавая бітва пад Прохараўкай на Белгарадчыне. Сёння тут далёка чутны звон каля манумента Перамогі. Звон б'е тры разы ў гадзіну — кожныя дваццаць хвілін. Першы раз — у памяць пра герояў Кулікоўскага поля, другі — пра салдат Барадзіно, трэці — пра перамогу ў Прохараўскай бітве. Тое, што адбывалася пад Прохараўкай 12 ліпеня 1943 г, відавочцы параўноўвалі з пеклам: неба пацямнела ад самалётаў, поле стала чорным ад танкаў. Грукат артылерыйскай кананады, выбухі авіяцыйных бомбаў скалыналі зямлю. На параўнальна невялікім полі — 15 кіламетраў у даўжыню і 8 у шырыню — сустрэліся тысячы адзінак бранятэхнікі. Цяпер гэтыя месцы абвешчаны запаведнымі, створаны Дзяржаўны ваенна-гістарычны музей-запаведнік «Прохараўскае поле», які ўключае ў сябе і помнік Перамогі — званіцу.

### Было сказана

**Вальтэр, французскі філосаф:**

*«Розум чалавечы ніколі і нічога больш высакароднага і карыснага, чым тэатральныя пастаноўкі, не вынаходзіў як для ўдасканалення свайго, так і для ачышчэння маралі».*

НАРОДЖАНЫЯ 12 ліпеня

**У гэтых людзях жыве прыродны дар утаймавальнікаў, яны могуць уздзейнічаць на апанента ласкава і з усмешкай, зрэдку пагрозай, але часцей за ўсё ім хапае пачуцця гумару, каб пакласці праціўніка на лапаткі. Яны бываюць празмерна патрабавальнымі бацькамі. Яны добрыя не толькі ва ўменні пераконваць, але і ў ініцыіраванні дзеяння. Падобныя праблемы ўзнікаюць і ў любоўных адносінах, таму ім доўга не ўдаецца знайсці асабістае шчасце. На рабоце захапленне з боку калег выклікае іх кампетэнтнасць, яны незаменныя ў ролі арбітраў. Каб захаваць добрыя адносіны з навакольнымі, яны калі-нікалі павінны адысці ўбок, дазволіць іншым прымаць рашэнні і адчуваць сябе героямі.**

НАРОДЖАНЫЯ 13 ліпеня

**Яны звычайна адчуваюць момант і, ухапіўшыся за магчымасць, рана ці позна становяцца на шлях, які вядзе да поспеху. Яны могуць пачаць свой узлёт з самых нізкіх пазіцый, няўхільна набіраючы моц, імкнуцца наперад; могуць пакінуць усё, што набылі і чаго дасягнулі, і пераехаць у іншую краіну; могуць змяніць абжытае месца, работу і памкнуцца да новых заваяванняў. Блізкім застаецца толькі верыць у поспех іх дзеянняў. Гэтыя людзі здольны на сапраўднае сяброўства, не церпяць глупства і бязглуздзіцы, лёгка кідаюць тых, хто ім здраджвае.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Печыва з манных круп

***Спатрэбіцца:*** *крупы манныя — 2 шкл., мука пшанічная — 1/2 шкл., сода — 1/2 ч.л., яйка — 2 шт., цукар (125 г у печыва, 150 г для сіропу) — 275 г, масла сметанковае — 75 г, сок апельсінавы — 100 мл, вада — 200 мл, мёд — 1 ст.л., спецыі (карыца, гваздзіка) — на смак.*



Спачатку змешваем сухія інгрэдыенты: манныя крупы, прасеяную муку і соду. Яйкі злёгку ўзбіваем са 125 г цукру. Дадаём сок і растопленае масла. Настаў час змяшаць сухія кампаненты з вадкімі. Змешваем і абавязкова даём цесту пастаяць не менш за 30 хвілін, каб манныя крупы разбухлі. Часам цеста атрымліваецца вадкаватым. Нічога страшнага — смела дадавайце мукі, каб не ліпла да рук! З цеста рукамі трэба будзе зрабіць ляпёшкі прыкладна 3 см у дыяметры. Выкладваем на бляху (альбо змазаную алеем, альбо накрытую пергаментам) — і ў разагрэтую да 150 градусаў духоўку на 15–20 хвілін!

А ў гэты час варым сіроп: даводзім да кіпення ваду, дадаём цукар і мёд, гваздзіку і карыцу. Даём пакіпець хвілін 5–6, каб сіроп трохі загусцеў. Гарачае печыва акунаем у прыгатаваны сіроп. Усё, печыва гатова!



## Курыныя кумпячкі па-еўрапейску

***Спатрэбіцца:*** *кумпячкі курыныя — 1–1,5 кг, морква — 3 шт., перац балгарскі — 3 шт., бульба маладая — 1 кг, алей — 6 ст.л., соль, часнок, перац духмяны, сухія праванскія травы.*

Курыныя кумпякі рассячы на 2 часткі. Ачысціць і нарэзаць буйнымі (па 2–3 см) кольцамі моркву. Перац нарэзаць на буйныя квадраты. Бульбу добра памыць са шчотачкай (калі запякаць у мундзіры) і нарэзаць буйнымі долькамі. У алей дадаць соль, травы, часнок і молаты духмяны перац. Змяшаць рукамі кумпячкі, гародніну з марынадам і выкласці ў глыбокую бляху. Запякаць у разагрэтай да 200 градусаў духоўцы хвілін 40, перыядычна змешваючы.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Сумка з парасона

**Парасоны бываюць розныя: сінія, зялёныя, чырвоныя… І як шкада бывае, калі яны ламаюцца. Але не спяшайцеся іх выкідваць: з любімага парасоніка можна пашыць прыгожую сумачку.**



1. Акуратна адпорваем парасон ад каркаса. Шво па краі акуратна зразаем. З цэнтра парасона выразаем круг радыусам 8–10 см, і па краі парасона зразаем палоску шырынёй 7–8 см.



2. Складкі могуць быць аднабаковымі, сустрэчнымі, бантавымі.

У нашай мадэлі іх будзе 16. Разлік шырыні складкі: 126 см (даўжыня па краі парасона, складзенага ўдвая) мінус 28 см (шырыня сумкі ў гатовым выглядзе) і дзелім на 8 (колькасць складак на палове парасона), атрымліваем крыху больш за 12 см. Даўжыня складкі 8 см. Складкі сашчэпліваем, правяраем шырыню сумкі. На гэтым этапе шырыню сумкі па версе можна адрэгуляваць, змяняючы глыбіню складак.



3. Складкі сшываем, запрасоўваем у адзін бок і замацоўваем іх машынным радком па краі сумкі. Сшываем дно сумкі, закругляючы ў ражках.

4. Прышываем ручкі, якія можна зрабіць з аздобнай тканіны, са шнура для штор, сшыць з палосак, якія зрэзалі па краі парасона, і г. д.

5. Верх сумкі апрацоўваем абточкай са зрэзаных раней палосак. Абточку ўмацоўваем дублірынам. Сфастрыгоўваем край сумкі, пракладваем аздобны радок па версе сумкі і прапрасоўваем.



6. Пераходзім да падкладкі. Раскладзіце сумку на стале, прыгладзьце рукой закладзеныя складкі, і вы ўбачыце, якога памеру і формы вам трэба выразаць падкладку. Выкройваем падкладку па форме сумкі. Прычым да нізу пашырэнне неабходна зрабіць большым, бо трэба будзе сшыць ражкі, неабходныя для стварэння аб'ёму. На падкладку настрочваем кішэні (для мабільніка, ключоў, кашалька). Сшываем дэталі падшэўкі, пакідаючы невялікі ўчастак для выварочвання сумкі. Прыфастрыгоўваем падкладку да абточкі і прышываем.

7. Для зашпількі можна выкарыстоўваць стужку-ліпучку, маланку або зрабіць пятлю і прышыць прыгожы гузік.



8. Для дэкаратыўнага элемента нам спатрэбіцца круг, выразаны спачатку. Па краі круга праходзім касымі шыўкамі, сцягваем нітку і замацоўваем. У цэнтры прышываем якое-небудзь упрыгажэнне.

9. Сумку выварочваем, робім канчатковую вільготна-цеплавую апрацоўку, прымацоўваем аздобную дэталь і зашываем участак, пакінуты для выварочвання.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.53 | 21.37 | 16.44 |
| Віцебск | — 4.35 | 21.34 | 16.59 |
| Магілёў | — 4.43 | 21.27 | 16.44 |
| Гомель | — 4.48 | 21.15 | 16.27 |
| Гродна | — 5.10 | 21.50 | 16.40 |
| Брэст | — 5.19 | 21.43 | 16.24 |

## Месяц

***Поўня ў 14.24.***
***Месяц у сузор'і Казярога.***

## Імяніны

***Пр.*** *СВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА.*
***К.*** *Веранікі, Веры, Яніны, Андрэя, Брунона, Васіля, Яна.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Правіла лета: уся садавіна, якая ўпала на падлогу, аўтаматычна становіцца чыстай, калі на яе падзьмуць!

**Фатограф на вяселлі:**
**— Ну і дзе ж наша шчаслівая пара?**
**Адзін з гасцей:**
**— Ды вось жа яны — нявеста і яе мама...**

Тэрмінова! Шукаю сваякоў у Егіпце. Можна — на Мальдыўскіх астравах! Сумую, сіл няма!

**У таты згубілася папруга. Два тыдні ў сям'і пануе беззаконне.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.582. Індэкс 63850. Зак. № 2837.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2014 года.